


**Рэдакцыйная калегія**:

Наталля Давыдоўская, Кірыл Дубоўскі

**Вёрстка**:

Вольга Давыдзік

**Фота**:

Яўген Атцецкі

"ПАМІЖ", літаратурны і філасофскі часопіс, выдаецца з 2001 г.

Адрэса ў інтэрнеце:

http://bk.baj.by

# Ад рэдакцыі

Пра крызіс сёння не гаворыць толькі лянівы. Для кожнага з нас стала відавочным, што схавацца ад яго немагчыма. Зрэшты, хованкі — шлях заўсёды тупіковы. Крызіс, па-сутнасці, — гэта самая нармальная з'ява на свеце. Ен спадарожнічае чалавеку ўсё жыццё: крызіс трох гадоў, падлеткавы, светапогляду, сярэдняга ўзросту, сямейных стасункаў... Больш за тое, культуру і гісторыю 20 стагоддзя немагчыма апісаць, не выкарыстоўваючы гэтага панятку, столькі крызісаў чалавецтва не перажывала, мусіць, за ўсю гісторыю: крызіс (а часам і наогул канец) рэлігіі, ідэнтычнасці, культуры, літаратуры, суб'екта і г.д. да бясконцасцг. Калі браць нашу культуру, то немагчыма ўявіць, напрыклад, беларускую мову не ў стане крызісу.

Ва ўсіх гэтых такіх на першы погляд аддаленых адзін ад аднаго паняткаў — адзін корань. Нас у гэтым часопісе цікавіць сам феномен крызісу, розныя яго мадыфікацыі. Крызіс мы заўважаем тады, калі пачынае хістацца звыклы стан рэчаў, калі губляецца стабільнасць і мы не ведаем, што будзе далей — перамога альбо параза. Любы крызіс — гэта пераход, змена, у любым крызісе (сучасным эканамічным альбо нейкім глыбока асабістым) мы вылучае галоўнае — чалавека перад абліччам зменаў, ягоны асабовы, экзістэнцыйны патэнцыял. Што будзе ён рабіць: хавацца ў бульбу ці, зразумеўшы, як лірычны герой А.Разанава, што "адзіная адвечна ўстойлівая апора — гэта страчванне яе", будзе крочыць далей і імкнуцца перамагчы?

Крызіс — гэта яшчэ не катастрофа, але толькі магчымасць яе. XX стагоддзе абвясціла шмат крызісаў/смярцей: смерць Бога, аўтара, літаратуры, суб'екта... Але мы бачым, як зноў аднекуль з'яўляюцца, хоць і рэдка, Вернікі, Аўтары, Асобы. Можа, пачынаецца крызіс эпохі сімулякраў?

Крызіс — гэта стан ПАМІЖ, гэта выклік чалавеку і чалавечы адказ на выклік, гэта не тупік, а шлях.

**Наталля Давыдоўская**

# Гутарка з Юрыем Станкевічам

## "...Мяне хвалюе лёс свайго народа, які апынуўся "ля нуля..."

*З пісьменнікам Юрыем Станкевічам гутарыла Натальля Давыдоўская*

**Н.Д.**: Многім вашым творам, ды і творчасці ў цэлым, уласціва апакаліптычнасць, прычым у песімістычным сэнсе гэтага слова. Але ўся хрысціянская апакаліптычная культура скіравана на пазітыўны фінал, на абсалютную перамогу дабра. А.Мень назваў "Апакаліпсіс" самай светлай кнігай Новага Запавету. А вы, як мне падаецца, ідэалагічна бліжэйшы да атэістычнага апакаліптызму 20 стагоддзя. Аднак нават пасля абсалютнага нуля мае пачацца адлік. Як вы лічыце, што будзе пасля канца (для ўсяго чалавецтва і для беларускай нацыі)? І ці наогул нешта будзе?

**Ю.С.**: Адкажу сціпла і, па магчымасці, коратка. Стрыжань хрысціянства, на мой погляд, — гэта вера ў васкрэшанне, а значыць, па сучасных поглядах, у бессмяротнасць для тых, хто гэтага быццам варты. Увогуле — магчы- масць самой бессмяротнасці, якую трэба заслужыць. І калі багатыя на грошы алігархі пасля 60-ці ліхаманкава скідваць іх, грошы, на яе пошукі, то бедныя перад страхам смерці змушаныя скіроўвацца пераважна на веру. Я ведаю многіх людзей, якія пашкодзілі сваю псіхіку ў гэтым напрамку. Мне бліжэйшая трактоўка хрысціянства Ф.Ніцшэ, а не "мутняк" А.Меня, пры ўсёй павазе да загінуўшага. Тым больш, што квантавая прырода мозгу перакрэслівае самаю ідэю бессмяротнасці.

Вядома, як этнічнага беларуса, мяне хвалюе лёс свайго народа, які апынуўся "ля нуля". Магчыма, кропка невяртання ўжо ім пройдзена, але нацыянальная ідэя, я лічу, не загіне ніколі, як не знікае яна зараз, прыкладам, у ірландцаў, баскаў, курдаў і г.д.

**Н.Д.**: У наш час у Еўропе адбываецца размыванне культурных і нацыянальных межаў, даследчыкі адзначаюць такую з'яву, як крызіс нацыянальнай, культурнай, рэлігійнай і інш. ідэнтычнасцяў. На якія каштоўнасці варта арыентавацца сучаснаму чалавеку пры фарміраванні ўласнай культурнай прасторы? Ці існуюць нейкія ідэалогія, рэлігія, іншы феномен, здольныя скіраваць занадта прагматычнае мысленне сучаснага чалавека ў бок гуманітарных каштоўнасцяў, выратаваць яго ад "катастрофы свядомасці"? Якія дасягненні культуры/цывілізацыі вы лічыце найбольш значнымі? Якія перыяды ў гісторыі сусветнай культуры былі, на вашу думку, найбольш плённымі?

**Ю.С.**: Зноў-такі, лепшая арыентацыя — гэта нацыянальная ідэя. Лічу, што толькі яна здольная скіраваць чалавека ў бок асноўных каштоўнасцей. На жаль, палёты на Месяц, Інтэрнет і іншыя каласальныя тэхналагічныя дасягненні суседнічаюць з татальнай дэградацыяй. Маршыруюць жаўнеры, пастрэльваюць гарматы, нешта балбочуць псеўдалідэры, "папраўляюць" вяночкі ля квазісвятых месцаў; шматлікія "сліперы" "ташчацца" ад якога-небудзь новаспечанага пеўніка з яшчэ больш "лунным" паходкай, нехта з іх канчае жыццё самазабойствам па смерці свайго куміра, у цэнтры суседняй дзяржавы ўжо 90 год чэргі, каб паглядзець на труп ушанаванага іншародца, які знішчаў іх продкаў мільёнамі, цэлыя пакаленні "садзяцца на іголку" і г.д. У іх, дарэчы, усё добра з псіхікай?

**Н.Д.**: Вы часта звяртаецеся да тэмы дэградацыі беларускага насельніцтва. Героі, якія спрабуюць супрацьстаяць наступленню хаоса, як правіла, церпяць паразу калі не ў канкрэтнай сітуацыі, то ў перспектыве (напрыклад, Д.Прусак). У творах апошніх гадоў антаганістамі герояў ужо выступаюць не чужынцы, а дзеці, сваякі, суседзі. Ці ёсць, на вашу думку, такія жыццятворчыя сілы ў беларусаў, якія давалі б надзею на перамогу над хаосам?

**Ю.С**.: Я ўжо не лічу, што галоўная задача літаратуры — апісваць і "выкрываць". Гэта — бытавізм. Для мяне пройдзены этап. Вось вы сарамяжліва кажаце пра хаос. Але варта гаварыць пра нацыянальную катастрофу. Прайшло больш 10 год, як я напісаў "Пацукоў", і вось цяпер назіраю, як віртуальныя падзеі ў рамане пераходзяць у рэальнасць з клінічнай паслядоўнасцю і дакладнасцю. У мегаполісе гэта можа і незаўважна, а ў правінцыйным горадзе, дзе зараз часова пражываю, усё адбываецца на вачах. Вы пытаецеся пра жыццятворчыя сілы, якія б давалі надзею на перамогу? Так, яны, тым не менш, ёсць. Гэта моладзь, якая зноў жа выспавядае нацыянальную ідэю.

**Н.Д**.: Беларуская мова перманентна знаходзіцца ў стане крызісу. У сувязі з гэтым у нашым грамадстве перыядычна адбываюцца дыскусіі пра яе жыццяздольнасць/нежыццяздольнасць, пра шляхі яе папулярызацыі. Як вы глядзіце на гэтую праблему?

Ці звязаны лёс мовы з лёсам нацыі і нацы- янальнай культуры? Ці абавязкова заняпад мовы пацягне за сабой і заняпад культурнай, сацыяльнай, палітычнай сфераў?

**Ю.С**.: Сітуацыя з мовай — толькі фрагмент вышэйназванай катастрофы. На жаль, у нас гэтая праблема набывае ўжо ледзь не ганебную афарбоўку: супраціў русіфікацыі слабее з кожным днём, і наперадзе хіба што — пасмешышча. Ніхто ў свеце не прызнае народам насельніцтва, якое адраклося ад сваёй мовы.

**Н.Д**.: На сённяшні дзень вельмі шмат вядзецца гаворак пра тое, што беларуская літаратура павінна развіваць масавыя, папулярныя жанры, кнігі беларускіх аўтараў павінны прадавацца на вакзалах у мяккай вокладцы. Як вы ставіцеся да масавай культуры? Ці не будзе лепш, калі беларуская культура застанецца элітарнай, а масы па-ранейшаму будуць глядзець серыялы па-руску?

**Ю.С**.: Маскультуру прадуцыруе розум яе стваральнікаў. Не напіша ж Курэйчык "Каласы пад сярпом тваім". Авось "любовь-морковь" — калі ласка. І на мове суседняй краіны, у якой яму скінуць аб'едзеную костку за халопства. Масы чытаюць Фрыдрыха Незнанскага, які (нанятыя ім "літнегры") піша па 60 раманаў у год і шчасліва жыве ў якой-небудзь Нямеччыне, пасмейваючыся з дурняў-чытачоў. Масы будуць глядзець тую ж "Любовь-морковь", чытаць Данцову і, як трапна выказалася Света Алексіевіч, лічыць усіх нас з нашай беларушчынай і элітаршчынай за гарадскіх вар'ятаў.

**Н.Д**.: Што вы думаеце пра крызіс літаратуры? Ці існуе ён? Як выглядае сучасная беларуская літаратура на фоне сусветнага літаратурнага працэсу?

**Ю.С**.: Вядома, літаратура ў свеце пахіснулася пад наступам відэакарцінак, але знішчыць яе не атрымаецца. Тут я аптыміст. На фоне гэтага працэсу і наша беларуская літаратура выглядае даволі прыстойна. Ёсць маладыя аўтары, у якіх адсочваецца вялікі талент. Не сумняваюся, што ў хуткім часе ў Беларусі з'явіцца хто-небудзь кшталу эстонца Яана Кроса.

**Н.Д**.: У апошні час вялікую папулярнасць набываюць аўдыёкнігі. На вашу думку, ці здольныя яны прыцягнуць увагу да літаратуры? Ці, наадварот, сведчаць пра зніжэнне цікаўнасці да яе?

**Ю.С**.: Аўдыёкнігі — нешта штучнае, але... хто ведае. Пакуль я з гэтым не сутыкаўся, хоць ёсць прапанова агучыць мой апошні раман "П'яўка".

**Н.Д**.: Р.Барт прыпісваў крытыцы чыста фармальную, з пункту гледжання логікі, функ- цыю — навязваць, прыстаўляць да твора нейкі ідэалагічна абцяжараны сэнс. У дачыненні да вашай творчасці крытыкі ўмоўна падзяліліся на апалагетаў і антаганістаў. Першыя нярэдка апелююць да таго, што ў вашых творах паказана "суровая праўда жыцця", другія абвінавачваюць у празмернай змрочнасці хранатопу і адарванасці ад жыцця. На вашу думку, якім чынам мастацкі свет, створаны вамі, суадносіцца са светам рэальным? І наколькі важная для добрага твора рэалістычнасць?

**Ю.С**.: А хто мне дакладна скажа, што такое рэальны свет? Ён рэальны толькі ў маёй свядомасці, і такім я яго ўяўляю, але які ён на самой справе, пэўна, не ведае ніхто. Лепшай кнігай усіх часоў і народаў неафіцыйна прызналі нядаўна "Дон Кіхота" Сэрвантэса. Там рэальнасць праламляецца праз свядомасць апантанага (па-сутнасці, хворага на шызафрэнію). Рэальнасці Ф.Кафкі, М.Гогаля, Ф.Дастаеўскага непараўнальна далёкія ад той рэальнасці, да якой нас прывучаюць.

Што тычыцца крытыкаў, то чытаць некаторых з іх часам забаўна: кожны абзац сведчыць пра тое, што аўтар яўна атрымаў "заказ" на "ўкушэнне". У некаторых гэты "блашыны" сіндром заходзіць даволі далёка, але, урэшце, яны нічога істотнага так і не дабіваюцца. Горш, калі з міністэрстваў пачынаюць тэлефанаваць у рэдакцыі з "прапановай" не друкаваць Станкевіча. Тым не менш, знаходзяцца і сярод крытыкаў людзі смелыя, з вялікім інтэлектуальным патэнцыялам.

**Н.Д**.: Сярод абвінавачванняў, якія прагучалі ў ваш адрас ад крытыкаў, досыць важкае месца займае наступнае: апісваючы змрочны і безнадзейны стан сучаснасці, паказваючы агідныя балячкі грамадства, вы ніколі не прапаноўваеце ніякага выйсця. Што вы можаце адказаць на такія закіды? Чым выклікана такая рыса творчасці: перакананасцю, што выйсця няма; тым, што мастацтва не павінна даваць адказы; нечым іншым?

**Ю.С**.: Дык можа яны самі прапануюць? У сэнсе — якога выйсця. Альбо хто-небудзь адзін з іх? Тады няхай агучаць, а не істэрычна патрабуюць ад мяне. Я што — блажэнны? Я ўвогуле не вельмі схільны да аналітычных прагнозаў. Ну, можа маю крыху інтуіцыі, не больш. І я ні з кім не гавару, ні з якімі там чытачамі, а гавару з тымі "сіламі жыцця", якія мяне акаляюць, выказваю ім сваё разуменне рэальнага свету, якім я яго бачу.

**Н.Д**.: На вашым сайце змешчаны два творы для дзяцей, якія ў ідэйным плане адрозніваюцца ад твораў для дарослых толькі адным, але важным, пунктам: у іх вы прапаноўваеце праграму супрацьстаяння жыццёвым абставінам. Усё астатняе (гіпертрафавана змрочны хранатоп, карціна дэградацыі беларускага грамадства) не змяняецца. Ці можна лічыць гэтыя творы вашым адказам на пытанне "што рабіць", якога так праглі крытыкі?

**Ю.С**.: На жаль, большасць апаведаў для дзяцей згублена. Іх няма на сайце, хоць яны дзесьці захаваліся, надрукаваныя ў часопісах і газетах.

**Н.Д**.: Пытанне ў сувязі з папярэднім. Ці важныя для вас спробы характарыстыкі вашай творчасці праз вызначэнне стылявой прыналежнасці? Як вы пракаментуеце наклейванне да вашага імя такіх цэтлікаў, як "правы пісьменнік", "расіст", "праўдаруб" і да т.п.?

**Ю.С**.: Што ж — правы, значыць, так яно і ёсць. Магчыма толькі правыя і выратуюць гэты свет. Абвінавачванні ў, як зараз кажуць, непаліткарэктнасці — гэта завуаліраваная і мэтаскіраваная спроба ўхіліцца ад аб'ектыўнай ацэнкі *рэальнасці.* Аналізуйце некаторыя творы Дастаеўскага. Яго таксама можна залічыць у "правыя". Ярлыкі ад "расіста" да "фашыста" ў розныя часы наклейваліся Л.Ф. Селіну, Э.

Паўнду, І. Буніну, К. Гамсуну (кнігі апошняга тапілі ў моры, а самога скіравалі ў "дурку"), з сучасных — Д.Кутзее, М.Уэльбеку і г.д. Сярод гэтых імёнаў ёсць і нобелеўскія лаўрэаты.

**Н.Д**.: Ці верыце вы ў тое, што літаратура здольная мадэляваць рэальнасць, уплываць на гісторыю? Ці яна абмяжоўваецца адно прагнозамі? У чым, на вашу думку, прызначэнне прозы сёння?

**Ю.С**.: Не веру. Калі чарговы маралізатар спыняецца на плошчы і пачынае кры чаць, то нейкі час натоўп яго паслухае, а по тым зноў скіруецца па сваіх справах, намерана выкінуўшы з галавы тое, што пачуў. Як трапна выказаўся Мігель Унамуна, "праўда — нешта страшнае, невыноснае і смяротнае". Успомнім А.Салжаніцына: яго маралізатарства выклікала хіба што раздражненне і злосць, а расейскі народ выбраў у лік сваіх асноўных гераічных постацяў постаць Сталіна.

**Н.Д**.: Адзін з артыкулаў, прысвечаных раману "Любіць ноч — права пацукоў", называецца "Не пасаваць перад сцяной...". У ім даводзіцца, што гэтая цытата адлюстроўвае галоўную думку твора. У той жа час фінал рамана паказвае, што трагедыя будзе толькі нарастаць, што адна маленькая перамога нічога не значыць перад вялікай паразай у будучым. Ваш найбольш знакаміты раман — вельмі песімістычны, пакідае мала надзеі, але ў ім прысутнічае герой-змагар. Ці ёсць сэнс "не пасаваць перад сцяной"? Ці можа асоба супрацьстаяць абставінам? Якая роля наканаванасці, вышэйшай волі ў нашым жыцці?

**Ю.С**.: Я перарос гэты раман. Тым не менш, як казаў вышэй, з немалым здзіўленнем бачу, што праз пятнадцаць год падзеі з яго злавесна адбываюцца цяпер побач.

**Н.Д**.: Ёсць пісьменнікі мовы, стылю, а ёсць тыя, для каго галоўнае — сэнс, хоць у літаратуразнаўстве даўно лічыцца аксіёмай, што межы паміж зместам і формай размытыя. Наколькі важнае для вас знешняе афармленне твора? Чым можна растлумачыць неахайнасць стылю, знешнюю "непрычасанасць" вашых твораў: пагардай да такіх дробязяў, адсутнасцю карэктараў, нечым іншым?

**Ю.С**.: Я не бегаю, як некаторыя з пісьменнікаў, са сваім чарговым "творам" па знаёмых, не чытаю ім урыўкі, каб потым унесці карэктывы. Я не ствараю "неахайнасці", хоць некалькі разоў яна і мела месца. Вінаватыя ў гэтым тыя, хто без дазволу аўтара бярэцца правіць твор, не адчуваючы яго стылю і рытму. Не аднойчы даводзілася прабачацца праз Інтэрнэт. Ддзіны выхад — заўсёды вычытываць тэксты апошнім.

**Н.Д**.: У некаторых творах вы выкарыстоўваеце так званыя вечныя/традыцыйныя матывы і вобразы: зорка палын, д'ябал, эрыніі, нашэсце саранчы як прыкмета канца свету. Наколькі важная для вас культурная/літаратурная традыцыя пры напісанні твора? Наколькі важна чытачу ведаць крыніцу цытавання/алюзіі/першаўзора для адэкватнага ўспрымання твора? Якія пісьменнікі/творы для вас з'яўляюцца аўтарытэтнымі? Хто/што паўплывала на вашае станаўленне як празаіка?

**Ю.С**.: А вы уважліва пачытайце "Вандроўніка" Гамсуна, "Чуму" Камю, асобнае з Караткевіча, Гарэцкага, Чорнага. І — зарадзіцеся на аптымізм.

**Н.Д**.: Ці бываюць у вас творчыя крызісы? Як вы іх пераадольваеце?

**Ю.С**.: Я не настолькі маштабны і "раскручаны", каб гаварыць пра творчыя крызісы. Асноўны крызіс — прыхаваная забарона друкавацца. Я сам працаваў рэдактарам і ведаю, што "пройдзе" ў друк, а што — не. Цяпер гэтыя "не" сцёрлі нешматлікія "так".

**Н.Д**.: Ваш сайт не абнаўляўся з ліпеня 2008 года? З чым гэта звязана?

**Ю.С**.: Пісаў раман "П'яўка".

**Н.Д**.: Якая ваша мэтавая аўдыторыя? Наколькі важна для вас чуць водгук чытачоў, прызнанне вашага таленту?

**Ю.С**.: Я не паддобрываюся і не лісліўлю перад чытачамі, бо я гавару не з імі. Не бегаю па літтусоўках з "вырачанымі" вачыма, не шаркаю нагамі ў аўдыторыях. Чытачы самі вызначаюць, ці варты я таго, каб адымаць іхні час. Вось Сартр, напрыклад, бегаў са сцягам з маладымі ў час "левых" хваляванняў. Як вынік — трапіў пад астракізм. Пісьменнік, урэшце, сам павінен адчуваць — ёсць яму што сказаць, альбо — не, і своечасова спыніцца.

## Вольга Ціхановіч

### Катэгарызацыя падзей як крызісных, альбо У якіх выпадках мы кажам "крызіс"

У сучасных навуковых (і не толькі навуковых) дыскурсах так часта выкарыстоўваецца тэрмін "крызіс", што гэта не можа не здзіўляць. Звязана такая актыўнасць, найперш, з глабальным эканамічным крызісам, аднак жа звяртаемся мы да гэтага панятку не толькі ў сувязі з эканомікай. Слова "крызіс" ужываецца, калі справа ідзе не толькі пра самыя розныя, але часта нават пра несумяшчальныя з'явы: страта сэнсу жыцця, смерць блізкага чалавека, пераход дзіцяці на іншую стадыю развіцця і г.д. Паўсюль адны крызісы. Але чаму мы катэгарызуем тую ці іншую падзею як крызісную, застаецца не зусім зразумелым. Памятаючы словы прафесара Прэабражэнскага пра тое, што першапрычыну хаосу трэба шукаць у галовах, мы таксама будзем шукаць прычыны крызісу менавіта ў галовах, а значыць, зоймемся яго псіхалагічным складнікам. Асноўнымі пытаннямі, на якіх засяродзіцца наша ўвага, будуць наступныя: што такое псіхалагічны крызіс? якія існуюць шляхі развіцця крызісу? што значыць перажыць крызіс? чаму мы катэгарызуем тую ці іншую падзею як крызісную?

Праштудзіраваўшы псіхалагічную літаратуру па нашай тэме, мы можам зрабіць выснову, што крызіс — гэта... (далей павінен быць вялікі спіс самых розных азначэнняў са спасылкамі, які аўтар лічыць за лепшае не прыводзіць у дадзеньш тэксце). Абмяжуемся толькі тымі характарыстыкамі, якія паўтараюцца ва ўсіх крыніцах: раптоўнасць і ўплыў на асобу ў цэлым. Вызначальным словам у апісанні крызісу выступае, як правіла, тэрмін "падзея" (і — "крызісная падзея"). Такім чынам, можна ка- заць пра тое, што крызіс — гэта падзея, яна адбываецца раптоўна і ўплывае на асобу ў цэлым.

Аднак жа прапанаванае вызначэнне, калі паспрабуем прыкласці яго да жыцця, толькі збівае з толку. Наша жыццё насычана падзеямі, болыпасць з іх мы не прагназуем, многія з іх у стане змяніць нашае ўспрыманне свету. І, тым не менш, гэта зусім не азначае, што кожная падзея на нашым жыццёвым шляху будзе крызіснай. А значыць, існуюць некаторыя спецыфічныя фактары, якія ўплываюць на нашу ацэнку.

Каб больш прадметна разгледзець гэтыя механізмы катэгарызацыі, звернемся да кожнага з паняткаў. Першы з іх — "падзея", або "крызісная падзея". У псіхалогіі, у самым агульным выглядзе, вылучаюць два віды крызісаў: нарматыўныя (іх пражывае кожны, напрыклад, крызіс пераходнага ўзросту) і ненарматыўныя (падзеі, якія немагчыма прадбачыць і якія здараюцца не з кожным, напрыклад, невылечная хвароба). Адразу зробім агаворку, што далей мы будзем разглядаць менавіта ненарматыўныя крызісы. Крызіс развіваецца ў пэўных кірунках: асабістым (абумоўлены унутранымі псіхалагічнымі новаўтварэннямі асобы) і сітуацыйным (шэраг знешніх уздзеянняў). Відавочна, асабістыя і сітуацыйныя фактары ўзаемадзейнічаюць.

Такім чынам, перажыванне крызісу можна ўявіць у выглядзе ўзаемадзеяння двух суб'ектаў: сітуацыі і асобы (асобу пазначым тут, дзеля сціслasці, роднасным паняткам "Я"). Што ж уяўляе сабою працэс перажывання крызісу?

Пакажам перажыванне крызіснай падзеі графічна:




Я чалавека не стабільнае, натуральны стан для яго — няспыннае развіццё. У гэтым развіцці Я праходзіць некалькі этапаў, змяняецца, падпарадкоўваючыся унутраным інтэнцыям і адаптуючыся да знешніх уздзеянняў, але і пераўтвараючы знешняе асяроддзе (на схеме асоба паказана ў выглядзе круга з ядром Я).

Нумарамі 1 і 2 паказана развіццё Я да крызіснай падзеі. Мяркуецца, што асоба валодае пэўнымі ўнутранымі інтэнцыямі да самаразвіцця, а таксама на яе ўплываюць знешнія фактары (на схеме гэта — накіраваныя на Я стрэлкі). Сукупнасць гэтых уздзеянняў выклікае змены Я (пераход ад першага нумара да другога, ад другога — да трэцяга). Крызісная падзея, паказаная на схеме ў выглядзе дзвюх палосак, прыводзіць асобу да разладу з асяроддзем і з сабою.

Менавіта гэты разлад і вызначаецца асобай як крызіс. Аднак Я, як і любая іншая сістэма, імкнецца да етабільнасці, якой можна дасягнуць, узнавіўшы перарваны крызісам ход падзей або стварыўшы новую жыццёвую задуму. Гэтыя два кірункі пазначаны на схеме нумарамі $4^1$ і $4^2$ (ідэю мы запазычылі з тэорыі Ф.Васілюка, дзе яна вызначаецца паняткамі "крызіс першага роду" і "крызіс другога роду").

Такім чынам, мы кажам пра тое, што крызіс — гэта нейкі пераломны момант (у тэрміналогіі тэорыі сістэм — пункт біфуркацыі), які змяняе не толькі жыццёвую задуму, але і саму асобу.

Крызісная падзея — гэта такая падзея, якая парушае ўстойлівасць сістэмы, значыць, перажыць крызіс — гэта не што іншае, як узнавіць парушаны баланс у сістэме. Акрамя таго, як ужо гаварылася вышэй, развіццё Я, перарванае крызіснай падзеяй, імкнецца ўзнавіць страчаную раўнавагу. Гэта значыць, што калі ў выніку перажывання крызісу асоба здолее сфарміраваць новую жыццёвую задуму, прыняць новы вобраз Я (той, што ўзнік у ходзе перажывання крызісу), значыць, крызіс нясе ёй станоўчы досвед.

Аднак што ж для чалавека лепш — узнавіць перарваны крызісам ход жыцця або пад уплывам крызісу ўнесці ў яго карэктывы? Мяркуем, гэта не мае прынцыповага значэння. Галоўнае — каб сістэма Я знайшла раўнавагу. Больш за тое, крызісная падзея здольная адкрыць у асобе новыя аспекты, пра існаванне якіх яна сама не здагадвалася. Негатыўнае зцачэнне крызіс мае ў тых выпадках, калі асоба ў выніку не здольная перафармуляваць сваю жыццёвую задуму і прыняць сваё новае Я.

Адсюль вынікае, што крызісная падзея — такая падзея, якая змяняе жыццёвую задуму асобы. Аднак адкрытым застаецца пытанне пра механізмы катэгарызацыі падзеі як крызіснай.

У дадзеным кантэксце згадваецца парадаксальная тэорыя эмоцый Джэмса-Лангэ, у прыватнасці, мы паспрабуем вытлумачыць катэгарызацыю крызіснай падзеі тым самым спосабам, якім Джэмс-Лангэ тлумачылі узнікненне эмоцый.

Яны не пагаджаліся з тым, што "псіхічнае ўражанне, успрынятае ад нейкага аб'екта, выклікае ў нас душэўны стан, які называецца эмоцыяй, а апошняя прымушае нас рабіць нейкія рухі целам". Згодна з яго тэорыяй, наадварот, цялеснае ўзбуджэнне ідзе непасрэдна за ўспрыманнем факта, а ўсведамленне гэтага ўзбуджэння ў яго працэсе і ёсць эмоцыяй.

Паводле гэтай гіпотэзы, парадак падзей пры ўзнікненні эмоцый наступны: мы сустракаемся з якой-небудзь падзеяй, гэта выклікае ў нас адпаведныя цялесныя праявы, а за праявамі ідуць эмоцыі. "Вось чаму найбольш разумна казаць так: мы засмучаныя, таму што плачам; гневаемся, бо б'ем некага; баімся, бо дрыжым. Казаць жа: мы плачам, б'ем, дрыжым, бо засмучаныя, разгневаныя, напалоханыя — няправільна. Калі б цялесныя праявы не ішлі адразу за ўспрыманнем, то апошняе было б па сваёй форме бледным, пазбаўленым каларыту і эмацыйнай цеплыні пазнавальным актам. У такім выпадку мы маглі б убачыць мядзведзя і падумаць, што лепш было б уцячы, маглі б пачуць абразу і вырашыць, што трэба было б адказаць, але пры гэтым не адчувалі б страху ці гневу".

У дадзеным кантэксце нас цікавіць магчымасць пераносу асноўнага тэзісу гэтай тэорыі на перажыванне крызісных падзей, якое мы апісалі раней. Падзея ўспрымаецца як крызісная, калі яна змяняе Я, або змяняе Я, бо ўспрымаецца як крызісная? Што тут першаснае: падзея альбо нашая на яе рэакцыя?

Такім чынам, ёсць пэўная сітуацыя (яна пакуль не катэгарызуецца як крызісная), якая ўплывае на Я. Гэты ўплыў прыводзіць да асобасных змяненняў, а, значыць, да катэгарызацыі падзей як крызісных. Значыць, можна казаць пра тое, што не Я змяняецца пад уплывам крызісных падзей, а падзея "робіцца" крызіснай, калі ў выніку ўзаемадзеяння з ім змяняецца Я.

Адпаведна, трэба змяніць схему перажывання асобай крызісу: першапачаткова гаворка ідзе не пра крызісную падзею, а пра падзею ў чыстым выглядзе. Улічваючы гэта, можна казаць пра тое, што схема можа прымяняцца да любых падзей, з якімі сутыкаецца асоба, а колькасць падзей, катэгарызаваных як крызісныя, залежыць ад устойлівасці Я да знешніх уздзеянняў.

Падвядзем вынікі. Крызіс — паняцце суб'ектыўнае, і катэгарызацыя падзеі як крызіснай залежыць выключна ад псіхалагічных асаблівасцей чалавека. Гэта дазваляе знайсці падобныя элементы ў паняццях "крызіс" і "эмоцыя", а значыць, можна казаць не толькі пра эмацыйны складнік у перажыванні крызісу, а пра перажыванне крызісу як блока эмоцый, якія перажывае асоба падчас змяннення Я.

## Міхаіл Бараноўскі

* * *
Ты чула...
Як грукала дрэва...
Аб дрэва...
Калі мяне прыбівалі на крыж...
І папа Карла...
Самы непарочны...
З усіх пап...
Заліваў водку ў чэрава...
І было так страшна...
Што ў гэты дзень...
Не піскнула...
Ніводная мыш...
І нылі прабітыя...
Наскрозь далоні...
І вочы не бачылі...
Далей амерыканскай мілі...
І ліўся з вачэй...
Бярозавы сок...
Якім у дзяцінстве мяне...
Паілі...
Я не баюся...
Ні чорта...
Ні бога...
І магу паміраць іграючы...
Пакуль любоў бяжыць па аорце...
Ад сэрца...
Да самых ног...
І маіх дзераўляных пальчыкаў...
Пакуль твае вочы...
Не з'ела моль...
І шашаль...
Не з'еўдушу...
Можна пscore
Самай жорсткай зімой... Холад самых студзёных сцюж.
І толькі...
У пятніцу я...
Не магу глядзець...
Як з дрэваў...
Маёй бясконцай восені... Ляціць долу чырвоная медзь...
Бы з сабакі старая поўсць...

* * *

Забі мяне...
Гэта толькі ў тваей моцы...
Ты...
Што абудзіла мяне да жыцця...
Што пусціла па венах салодкі
кахання стронцый...
Забі мяне...
І з флагштока сарві мой сцяг...
Я не думаў...
Што будзе вось так балюча...
Што сінім полымем...

Згараць усе караблі...
Што комам будуць стаць у глотцы словы гаючыя...
І будзе комам апошні блін...
Хацелася жыць...
Як ніхто ніколі...
І шчасцем напоўніць...
Зоры тваіх вачэй...
І толькі вецер вые ў бязлюдным як сэрца полі...
І толькі знічкі коцяцца па шчацэ... Нібы ў кузні...
Звінела ўнутры жалеза...
І нешта біла што моцы па рэбрах у разнатакт...
І... Я не бачыў у гэту пару пралесак...
Што вясна накідала ў
свой нататнік...
Я шукаў пяты кут...
У горадзе без назовы...
Шукаў у крамешнай цемры яе руку...
І комам у глотцы стаялі
апошнія словы...
І рэхам апошні гук...

***

Пустоша...
Нібы крумкач...
Чорная...
Выела вочы...
Вонкі вывернула...
І я...
З аскалепкаў мовы Скарыны.
Майстраваў човен...
А выйшла дзіравая скрыня...
Скрозь радкі прасочваліся
чыесь цені...
У ценяў заўседы хапае сваіх турбот...
Я чуў што калісьці...
Яны знікалі...
Уткнуўшыся ў сцены...
І пакутавалі ад сухот...
Чорная...
Кроў...
Запяклася на вуснах...
У кожнай чарзе да бога...
Знойдуцца падкія да крыві...
З дзіравай шчакі...
Ліецца кефір...
Тлустны...
На посны мой краявід...
Пустоша...
Выела знутры...
Плыву па рацэ...
Нібыта пусты човен...
Незгаданым...
Словам...
Что калісь сарвалася на крык...
Утульнай труной...
Так і...

Не спазнанай мовы...

***

Жыві...
І кідай як мага далей камяні...
Да апошняй пары...
Каб потым...
Было што збіраць...
Пераблытаўшы верх...
І ніз...
Расці крэннямі...
Да гары...
І няхай яно ўсе гарыць...
Гарам...
Збіваючы ногі...
Ідзі наперад...
І можа ўвечары...
Дойдзеш...
Да самое сябе...
І побач будуць самыя простыя рэчы...
І зоры лепшых вачэй...
Заўседы нечага не хапае...
Каб зразумець...
Што няма межаў...
Гляжу...
Як гатуецца асцярожнае неба...
Праспяваць...
Першы восеньскі...
Дождж...

***

Ты калісьці казала...
Што ўмееш чытаць па руцэ.
Па яе цеплыні...
І пяшчоце...
Прачытай мне...
Калі ласка...
Казку...
Пра тое як песні рвуцца...
На волю...
Як бягуць...
Па сонечных шчоках...
Ты бачыла...
Як матыль...
Праз расчыненую фіранку...
Ляціць на свет?...
Так і людзі...
Наскрозь светла-цёмныя...
Цягнуцца з цемры...
Шукаючы лепшы свет...
І наадварот...
Але...
Яны нічым не адрозніваюцца...
Ты чула?..
Што сёння абяцалі...

Апошнюю навальніцу...
З грымотамі і моцнымі парывамі ветру...
Я калі пачуў...
Як дзіцёнак...
У далоні пляцаў...
Напэўна я яшчэ магу верыць людзям...
Калі ў прагнозы надвор'я веру...
Ты заўважыла...
Што ў горад завітала восень?..
Я сустрэў яе выпадкова на вуліцы.
Мы пазнаеміліся...
Ў мінулым годзе...
Калі не памыляюся...
Ў аўтобусе нумар восем...

***

Вось табе...
Сонечных промняў пыл...
Што ляціць скрозь дзіравую столь...
Кожны пан вяжа свае снапы...
І ліча ад аднога да стох...

Вось табе...
Літары першага слова...
Зямля...
На якой жыць...
Неба акрай...
Блакітнае волава...
І пад небам нашы крыжы...

Вось табе...
Новае неба...
Што ніколі не бачылі...
Мы з-пад сваіх дахаў...
Што ніколі да гэтага...
Нам не было патрэбна...
Пакуль аблокі не папаўзлі...
Па нашых слядах...

Вось табе...
Бяззубая шчырасць...
Рассыпаныя незнарок...
Чыесь галасы... і
Чыры...
Няўпэўнены першы крок...
Вось табе...

Масла і кукіш...
І ўсе сталовыя прыстасаванні...
Ад пахмелля глыток паветра...
Песня...
Што хочацца пець на світанні...
Што ірвецца з самых нетраў...

Вось табе...
Магчымасці без жаданняў...
Сырыя запалкі...
І тытунёвыя міты...
Не азірайся на шэрыя здані...
Яны самі баяцца сваіх прывідаў...

Вось табе...
І ў хвост і ў грыву...
І мне па самую першую лічбу...
Нельга так...
Але інакш...
Не было б парыву...
Але інакш як заўседы
З рук...
Абы...

Вось табе...
Жыві і радуйся...
Жонка дура...
І сын забойца...
І нікому не даць рады...
Не спыніцца...
Не супакоіцца...

Вось табе...
Колькі...
Колькі яшчэ трэба?
Нізка вершаў...
Ці можа... спатоліць смагу...
А нам усё...
Толькі хутчэй бы...
Ашто далей...
Без розніцы...
Кольт ці магнум?..

Вось табе...
Цела...
І на рэшту...
Сумленне і гонар...
Хадзі пад прыцэлам...
Не бойся хадзі пад прыцэлам...
І свет не падасца табе змярцвелым...
Насуперак волі ягонае...

Вось табе...
Пер'е...
Майструй што хочаш...
Жыві і лётай...
Жыві і лётай...
На шыбе...
Полымя...
Мінулай ночы...
І жураўліны вясновы клёкат...

Вось табе...
Сэрца...

І не пытай навошта...
Павер на слова што так неабходна...
Проста прыслухайся...
Як яно б'ецца...
Калі да чарцей...
Халодна...

Вось табе...
Усё...
Што калісь я зведаў...
Што пранёс праз бясконцую адзіноту...
На палёх палыновага пустацвету...
Кожды знойдзе...
Сваю...
Запаветную ноту...

Вось табе...
Вера...
Надзея...
І…
Яшчэ нешта...
Прабач...
Памяць з часам не ззяе ярчэй...
Але я памятаю...
Нешта было...
Здаецца было
Яшчэ...

## Павал Анціпаў

### Жыццё насякомых

Ну, давайце пафіласофствуем, падумаем, што мы сабой уяўляем, хто мы насамрэч, навошта гэтым займаемся і чаму не займаемся чым-небудзь іншым.

Добра, пра сябе думаць цяжка, возьмем хаця б Барыса. Нарадзіўся ў Смаленску, адвучыўся на эканаміста, пайшоў на працу, дзе добра плацілі. Здавалася б, жыві сабе прыпяваючы, рухайся па кар'ернай лесвіцы і збірай на дробныя і буйныя бытавыя прыборы. Жонку сабе завядзі, Барысе. Бяры дзяўчыну сціплую, каб зорак з неба не прасіла, і жыві з ёю душа ў душу. Хіба кепска? "Не кепска, — адказвае Барыс, — ды толькі як жа я сям'ю буду заводзіць, калі я не ведаю, хто я такі? Як я дзецям у вочы пагляджу і што адкажу, калі яны ў мяне спытаюць пра гэта ці, яшчэ горш, пацікавяцца, хто яны такія, кім ім быць? А я нават пра сябе не ведаю". Карацей, на працы Барыс сумуе, а ўвечары, замест дробных буржуазных радасцяў — піва, там, папіць, у більярд пагуляць, тэлевізар паглядзець . — Барыс піша апавяданні, і нават у яго ўжо гатовая адна аповесць. І вось ён здагадваецца, што ніякі ён не эканаміст, а штосьці накшталт пісьменніка, таму, відаць, і пакутуе на працы. Рабіць няма чаго: каб здагадкі пацвердзіліся, трэба ўсё кідаць і ехаць у Літаратурны інстытут, што ў Маскве. Гэтак ён і робіць.

А ў гэты час за тры з паловай тысячы кіламетраў у Алма-Аце, ажно ў іншай краіне, мучыцца юрыст Жумагул. І пакуты ягоныя рыхтык Барысавы. Дарма, што Жумаіул азіят і замест апавяданняў піша вершы. Бо калі ты працуеш на нялюбай працы, то не грае аніякай ролі твая раса, веравызнанне і схільнасць да аднаго з семінараў літінстытута.

Канечне, яны ідыёты — і Барыс, і Жумагул. Канечне, трэба было думаць раней і ў 17 гадоў вызначыцца з тым, куды паступаць. Але калі падумаць, лепей так мяняць жыццё, чым калі ўжо сям'я і дзеці. Бо калі сям'я і дзеці, нічогаўжо не зменіш. Так што, калі разабрацца, не такія ўжо ідыёты Жумагул з Барысам. Пагатоў, і аднаго і другога прынялі ў літаратурны інстытут без аніякіх пытанняў. Гэта абнадзейвала абодвух, яны былі ўпэўненыя, што неўзабаве знойдуць адказ на пытанне "Хто я такі?"

У пачатку верасня, цёплым сонечным днём, з захаду ў Маскву ўехаў Барыс. Адначасова з усходу прыбыў Жумагул. Захаду і ўсходу наканавана было спаткацца ў фае інтэрната літаратурнага інстытута.

Барыс прыйшоў першым.

— Дабрыдзень, — сказаў ён як мага больш па-пісьменніцку лысаму ахоўніку, які глядзеў тэлевізар у вахтавай будцы.

Ахоўнік зірнуў на Барыса і, нічога не адказаўшы, павярнуў галаву да экрана.

— Выбачайце, калі ласка, ці не маглі б вы мне падказаць, як мне засяліцца?

Ахоўнік нехаця павярнуўся і запытаў, паказваючы ў роце колькі залатых зубоў:

— А вы ўвогуле хто?

— Я — Барыс Ігнатаў, — вінавата вымавіў Барыс. Ён адчуваў, што адарваў ахоўніка ад чагосьці вельмі важнага.

— Навошта мне ведаць ваша імя, я пытаюся, вы — адкуль?

— Са Смаленску.

— Хоць з Караганды! Вучыцеся вы дзе? У школе эканомікі?

— Я ў інстытуце вучуся. У літаратурным інстытуце, — усё цішэй і цішэй гаварыў Барыс.

— Дзе-дзе!?

— У літаратурным.

— Адразу б так. Як прозвішча?

— Ігнатаў.

Ахоўнік парыўся, знайшоў прозвішча Барыса.

— Сядайце і чакайце, я скажу каменданту.

Ахоўнік сышоў, паказаўшы на спіне падпіс "Агент-1".

"Спадзяюся, ён тут такі насамрэч адзін", — падумаў Барыс і сеў. Агент-1 хутка вярнуўся і сеў далей глядзець тэлевізар, нібыта Барыса не існавала. А Барыс баяўся парушаць спакой Агента-1.

Хвілін праз дваццаць у інтэрнат зайшоў малады казах. Паўтарылася падобная сцэна.

— Вы хто?

Жумагул.

— Як жа вы мяне задзяўбалі! Вучыцеся вы дзе?

— Буду вучыцца у літаратурным інстытуце, — адказаў Жумагул.

Агент-1 зноў схадзіў кудысьці і вярнуўся да тэлевізара.

За наступныя паўгадзіны Барыс і Жумагул паспелі пазнаёміцца і напаўголасу, каб не перашкаджаць Агенту-1, абменьваліся сваімі біяграфіямі. Яны былі наіўна радыя таму, наколькі падобныя. Хаця адзін з іх — еўрапеец, а другі — азіят, усё ж такі яны знайшлі ў сабе сілы змяніць жыццё, як ім здавалася, да лепшага. Да канца размовы яны былі ў захапленні ад таго, што будуць разам вучыцца і жыць у адным інтэрнаце. Калі ўсе тэмы былі вычарпаны, Жумагул запытаў:

— Слухай, Бора, а чаго мы чакаем?

— Не ведаю, напэўна каменданта.

— Дык чаго ж ён не ідзе? Ты спытай у ахоўніка.

— Мне нейк няёмка. Спытай ты.

Жумагул падыйшоў да Агента-1.

— Прабачце, а доўга нам чакаць?

— Адкуль я ведаю? Вы што абодва не бачыце, я схадзіў да каменданта. Чакайце, вас паклічуць.

І яны чакалі. Гадзіну чакалі, дзве чакалі. Пакуль не выйшаў мужчына і не запытаў, чаму яны тут сядзяць. Гэта аказаўся камендант.

Барыса і Жумагула пасялілі ў пакой з двума голымі ложкамі, шафай, сталом і крэслам. Столь была ў цёмна-карычневых падцёках, з падлогі пахла нясвежым дывановым пакрыццём.

— Ну і пакойчык, — панура сказаў Барыс.

— Ага, не вельмі тут паважаюць пісьменнікаў, — Жумагул сеў на край ложка.

— Мы ж яшчэ не пісьменнікі,— удакладніў Барыс, — з пісьменнікамі б так не абыходзіліся. Спадзяюся, хаця б душ у іх тут ёсць.

Барыс узяў шампунь, ручнік і выйшаў з пакоя. Пахадзіўшы па калідоры, Барыс высветліў, што на цэлым паверсе быў толькі адзін душ. Натуральна, ён быў заняты, таму давялося чакаць ля зачыненых дзвярэй і ўяўляць чэргі, якія бываюць тут зранку. Літаратура пачала паказваць Барысу, якіх менавіта ахвяраў яна патрабуе.

Дзверы адчыніліся — і насустрач Барысу выйшла поўная чырванатварая *дзяўчына ў халаце* і з турбанам з ручніка на галаве. Усміхнулася. Барыс схамянуўся. "Няўжо так цяпер будзе кожны дзень?" Пакуль ён гэта думаў, яго адпіхнуў нейкі рабочы з развадным ключом і зайшоў у душ.

— Прабачце, але я наступны,— абурыўся Барыс.

— Куды прэш, не бачыш — рамонт?! — рабочы скруціў краны, шланг і сабраўся сыходзіць.

— А дзе ж мне цяпер мыцца? — здзівіўся Барыс.

— А скуль мне знаць, я што — камендант? — і пайшоў.

Барыс з нудою паглядзеў на мёртвы душ і пайшоў назад у пакой. Тарғануў ручку — зачынена. Барыс сеў пад дзвярыма і абхапіў галаву рукамі.

Жумагул тым часам ужо знайшоў прыбіральню і прыкідаў, як яму прысесці на ўнітаз, не датыкнуўшыся да завэзганага сядалішча і не намачыўшы порткі ў жаўтаватай вадзе, што хлюпала пад нагамі. Пра чалавека, які мала есць, звычайна кажуць, што ён харчуецца, як птушка. Жумагул харчаваўся нармальна, але, нягледзячы на гэта, яго цяпер таксама можна было параўнаць з птушкай — ён стаяў у адной з туалетных кабінак на напаўсагнутых нагах, рукамі-крыламі не даючы штанінам апусціцца да падлогі.

З кабінкі Жумагул кінуўся да рукамыйніка, нібыта думаў, што чым хутчэй ён памые рукі, тым хутчэй яго пакіне гідкасць да туалета. Тут ён са здзіўленнем пабачыў, што з суседняй кабінкі выйшла дзяўчына і таксама накіравалася да рукамыйніка. Прыбіральня была агульнай. *Яны* мылі рукі, намагаючыся не глядзець адно на аднаго.

Жумагул заспеў Барыса пад дзвярыма пакоя.

— Уяўляеш, душ зачынілі!

— Ты бачыў бы гэты туалет!

Адначасова абурыліся і Барыс, і Жумагул.

— Не, я гэтага так не пакіну,— запальваўся Жумагул.

— Зараз жа пойдзем да камендanta,— заявіў Барыс.

Сябры спусціліся на першы паверх. Барыс трохі нават груба піхнуў дзверы да каменданта, але адразу ж разгубіўся. У кабінеце сядзеў Агент-1 і раскладваў пасьянс на кампутары. Працоўны дзень каменданта скончыўся.

Расчараваныя, яны вярнуліся ў пакой і ўзяліся размаўляць пра сябе і літаратуру, якая запатрабавала ад іх ахвяраў.

— Як мяркуеш, ты пісьменнік, Барыс?

— Не ведаю. Я прыехаў сюды высветліць, хто я. Прынамсі, я дакладна ведаю, што я не эканаміст, хаця я ім працаваў.

— Так, я таксама працаваў не тым, кім хацеў бы. Думаеш, мы тут разбярэмся, хто мы?

— Упэўнены ў гэтым! — адказваў Барыс.

Потым яны далі адзін аднаму пачытаць свае апавяданні і вершы. Хвалілі адзін аднаго, крытыкавалі. Карацей, адчулі сябе сапраўднымі пісьменнікамі. Толькі не на доўга, таму што хутка ім захацелася пакурыць і яны пайшлі на вуліцу. Праходзячы паўз будку Агента-1, яны прыгадалі ўсё, што з імі адбылося сёння: і засяленне, і туалет, і душ.

Наступная раніца Барыса і Жумагула пачалася пад гукі дрылі. На паверсе распачалі рамонт, рабочыя свідравалі сцены, перапланіроўвалі пустыя пакоі, разбівалі перагародкі душа, адкручвалі дзверы, мянялі вокны. У інстытуце было тое ж самае. Лекцыі даводзілася слухаць пад грукат алюміневых лістоў, якія скідалі з даху рабочыя, падобныя да Жумагула. Каб прайсці ад корпуса да корпуса, трэба было абмінуць не адну кучу будматэрыялаў, панаваленых у двары літінстытута. Да апошняй пары, звычайна, шум заціхаў, і па інстытуце разносіўся пах ежы, якую гатавалі рабочыя, што жылі проста ў аўдыторыях. Перад ядой рабочыя мылі рукі, галовы і ногі ў туалеце, не саромеючыся студэнтаў.

У хуткім часе Жумагул і Барыс звыкліся з тым, як ім наканавана жыць некалькі наступных гадоў. Аднойчы яны ўсё ж такі схадзілі да рэктара паскардзіцца на жыццё.

— А чаму вы з гэтым пытаннем да мяне? — сумна спытаў рэктар, выслухаўшы блытаныя скаргі сяброў.

Няздольныя нічога годнага адказаць, Барыс і Жумагул адно толькі папрасілі прабачэння і выйшлі. Вышэй можна было скардзіцца толькі Госпаду, у якога яны не верылі, як і ў сябе.

Кожны новы выкладчык пачынаў лекцыю наступнымі словамі:

— Навучыць пісаць — немагчыма!

Відаць, заняткі ў інстытуце зводзіліся да таго, каб за два гады даказаць студэнтам гэты немудрагелісты тэзіс.

Адзін выкладчык прызнаўся на пары:

— За ўсю гісторыю існавання літінстытута з гэтых сценаў не выйшла ніводнага пісьменніка, за выключэннем тых, хто пісьменнікам сюды ўвайшоў.

А Барыс з Жумагулам не ведалі, кім яны ўвайшлі ў літінстытут. Яны ж спецыяльна для гэтага і прыехалі, каб дазнацца, хто яны такія. А выявілася, што гэта трэба было высвятляць загадзя.

Але нават калі б ім сказалі, што навучыць пісаць вельмі нават можна, то наўрад ці Барыс і Жумагул успрынялі б цяпер гэтыя словы ўсур'ёз. Яны ужо нават не здзіўляліся таму, што кожны новы дзень прыносіў з сабой новыя страты. Усё часцей яны сядзелі ў сваім пакоі і маўчалі, слухаючы, як на паверсе грукочуць дрылі і малаткі. Аднойчы ў іхны пакой прыйшоў электрык і скруціў усе разеткі, акрамя адной. Хлопцы нават не падумалі яму запярэчыць. А на наступны дзень зачынілі туалет і паабяцалі падсяліць двух студэнтаў са школы эканомікі.

Столькі было ўсяго ў інтэрнаце, што яны нават не звярнулі ўвагі на абвестку:

**Паважаныя студэнты**!
10 **кастрычніка ў** 19:00 **будзе праводзіцца апрацоўка супраць тараканаў**.
**Просім усіх быць дома**.

***Адміністрацыя***

А дарэмна, бо а 19:00 у пакой Барыса і Жумагула пагрукаў чалавек, які дапамог ім разабрацца з тым, хто яны такія. Чалавек быў у рэспіратары і з балонам хімікатаў.

— Вызваляем плінтусы! Апрацоўка тараканаў! — крычаў чалавек ў рэспіратары.

— Але ў нас няма тараканаў, — сказаў Жумагул.

Так усе спачатку кажуць. Трэба апрацаваць, — і пачаў абпырскваць пакой уздоўж плінтусаў.

Барыс закашляў першы, потым Жумагул. Ратуючыся ад хімікатаў, яны выбеглі на калідор, але там таксама пахла інсектыцыдам. Дзверы іншых пакояў былі расчынены. З іх, кашляючы, высыпаліся студэнты. Нехта хрыпеў і з чырвоным тварам падаў на падлогу, іншыя кідаліся да адзінага акна ў канцы калідора, каля якога ўжо тоўпілася чарада.

— Барыс, так больш жыць нельга! — паварушыў вусікамі Жумагул.

— Немагчыма, Жумагул, проста нязносна, — і Барыс задрабязіў лапкамі да вентыляцыйнай адтуліны пад столлю. Жумагул пабег следам. Астатнія студэнты неўзабаве рушылі за імі.

Агент-1 ішоў па паверсе і выключаў святло ў пустых пакоях.

## Більярд

*Усё наша жыццё — більярд,*
*і нікога не хвалюе,*
*ці ўмееце вы гуляць.*
***Джон Блэкбол***

— Ало, Ваня?

— Я.

— Пазнаў?

— А, здарова, Лёха! Даўно ты не тэлефанаваў.

— Што сёння робіш?

— Ну, не ведаю, трэба ЖЖ абнавіць.

— Мы з Дзімам вырашылі, што трэба сустрэцца. Паехалі ў більярд гуляць?

— Ну, не ведаю, мне яшчэ пошту праверыць трэба, адказаць усім.

— Паспееш яшчэ праверыць, я на машыне.

— У цябе ёсць машына?

— Даўно, з паўтара гады мо.

Халера, у Лёхі ёсць машына, а ў Вані няма. Непрыгожа неяк.

У дзяцінстве яны з Лёхам жылі ў адным двары, гуляліся ў пясочніцы, у вайнушку і казакоў-разбойнікаў, потым рэзаліся ў карты на лаўцы каля пад'езду, а часам — у шахматы. Карацей, да інстытута былі найлепшымі сябрамі. У 18 гадоў паступілі ў розныя ВНУ — з таго часу бачыцца пачалі радзей. А як уладкаваліся на працу, зусім ужо не перасякаліся, пакуль не патэлефанаваў Лёха.

Машына ў Лёхі была чорнага колеру, двух-дзверная. Пра такія, Ваня чуў, кажуць: спартовая. Для прыстойнасці трэба было б звярнуць увагу на марку, але Ваня быў занадта ўражаны тым, што ў ягоных сяброў могуць быць машыны, і забыўся на прыстойнасць.

— І колькі яна жарэ бензіну? — запытаў Ваня, калі Лёха завёў рухавік.

— Дзесяць літраў.

— Ого, — сказаў Ваня. Наогул, ён не ведаў добра гэта ці дрэнна, але проста трэба ж нешта запытваць ва ўладальнікаў аўтамабіляў і нешта трэба адказваць.

— Ты як там, працу яшчэ не надумаў мяняць? — пацікавіўся Лёха, і сам працягнуў.

— Я вось ужо мяняю, а то плоцяць неяк мала.

— Колькі?

Лёха змаўчаў.

— Дык колькі?

— Ай, не люблю я пра гэта разводзіцца.

— Ладна, давай каліся, калі пачаў, я ж свой чалавек, — Ваня павінен быў дазнацца, колькі могуць атрымліваць людзі ягонага ўзросту. Ён раптам адчуў, што нічога важнейшага за гэтую інфармацыю для яго на свеце няма, бо цяпер ён таксама хацеў машыну.

— Ну-у, — пачаў Лёха і потым назваў суму, роўную пяці Ваневым заробкам.

Жыў сабе Ваня — спакойна, добра і проста выдатна. І вось для чагосьці з'яўляецца гэты забыты Лёха і расказвае пра сябе такія рэчы. Ды яшчэ як расказвае! Нават не скажаш, што хваліцца: маўляў, Ваня сам пытаўся. А Ваня ўжо шкадаваў, што пытаўся, бо Лёха адчуў волю і пачаў апавядаць, колькі яму будуць плаціць на наступнай працы ў першы месяц, у другі, у шосты...

— А як там Дзіма? — ледзьве перапыніў сябра Ваня.

Калісьці Ваня і Лёха разам хадзілі на падрыхтоўчыя курсы, дзе пазнаёміліся з Дзімам. Выявілася, што гэтага дастаткова, каб вось так выбрацца пагуляць у більярд. З Дзімам, па словах Лёхі, усё было ў парадку, прычым трэба ж было Лёху агучыць яшчэ й Дзімаву зарплату, якая таксама складалася з некалькіх Ваневых.

— Слухай, Лёха, а навошта нам гэты більярд? Я ж і гуляў у яго ўсяго адзін раз і то п'яны. Можа ў піцэрыю?

— Не заганяйся, мы з Дзімам зусім не ўмеем гуляць.

Ваня трохі супакоіўся. Хаця, канечне, які тут ужо спакой?

Лёха прыпаркаваўся каля клуба, узяў з задняга сядзення невялікую торбу і праверыў, ці добра зачынены дзверы ягонай чорнай машыны. Дзіма чакаў ля ўваходу ў клуб з такой жа торбай, як у Лёхі.

— Здарова, даўно не бачыліся. Хадземце, я стол замовіў.

— Здароў. Вы што, торбы разам куплялі, ці што? — спытаў Ваня.

— Гэта не торба, гэта чахол для кія.

Зусім не ўмееце гуляць, — з дакорам кінуў Ваня і пайшоў следам за сябрамі.

Нешта Ваню зусім не хацелася запытваць, як жыццё ў Лёхі і Дзімы. Ён адчуваў, што гэта можа яго яшчэ больш расстроіць і нават выклікаць пытанні наконт Ваневага жыцця. А ў Вані ў жыцці нічога цікавага не было. Ён скончыў сабе інстытут, пачаў працаваць. Зарабляў столькі, што яму хапала. Нічога звыш, канечне, але нармальныя грошы. Так ён лічыў да сённяшняга дня, пакуль не сустрэўся з Дзімам і Лёхам.

Старыя сябры нічога не запытваліся. Хаця тое, што яны зрабілі, было, мабыць, яшчэ горш.

— Ведаеш правілы? — спытаў Дзіма.

— Не, — сумна сказаў Ваня.

— Гэта вельмі проста. Трэба забіваць у лузы шары свайго колеру. Станавіся, як я, так, выгніся.

— Слухай Дзіма, давай я проста шары паганяю.

— Ды пачакай ты, стойка важная для добрага ўдару. Пастаў ногі вось так, перадплечча перпендыкулярна сталу, а рука згінаецца пад вуглом 90 градусаў.

— Я не запомню.

— А як ты трымаеш левую? — хіхікнуў Лёха.

— Так, Ваня, не падварочвай пальцы. Трэба так: пакладзі даланю на стол, ссунь на сябе ўказальны палец, а вялікі проста падымі ўверх. Цяпер кій: вадзі яго раўнамерна, каб ён не матляўся ў цябе ва ўсе бакі.

Ваня дзівіўся, як гэта насуперак ягонай волі Цела падпарадкоўваецца Дзімавым указанням. Дзівіўся таму, як мог дазволіць зацягнуць сябе ў більярд. Як гэта так выйшла ў яго з машынай. То бок, як гэта ў яго не выйшла з машынай, тады як у іншых выйшла. І з заробкам у іншых атрымалася лепш, чым у Вані. Няўжо ён ні на што не здатны чалавек?

Што за лухта!

Ваня лепшы за іх усіх, ён ім яшчэ пакажа! Ён сканцэнтраваў увесь гнеў у правай руцэ і з усяе моцы дзеўбануў кіем па белым шары. Той імгненна перасёк стол і ўдарыўся ў трохвугольнік з 15 рознакаляровых шароў. Яны раскаціліся па ўсім стале.

— Малайчына, разбіў, — па-бацькоўску сказаў Дзіма, — цяпер трэба забіваць шары ў лузы. Галоўнае — асяцярожней з чорным шаром: хто яго забівае, той прайграў.

Гулялі на вылет. Лёха стаяў убаку і чакаў сваёй чаргі.

— Як маешся? — забіў Дзіма чырвоны шар.

— Ну, нармалёва, — прамазаў Ваня па карычневым.

— Дзе адпачынак праводзіў? — белы шар імкліва ўдарыўся аб борт стала, пакаціўся назад і стукнуўся ў аранжавы, ад чаго той павольна падкаціўся да лузы і з глухім гукам упаў у яе. — Дуплет!

— На Нарачы, у бабулі, — белы шар ударыў па карычневым і зваліўся ў лузу.

— Белы забіваць нельга, — сказаў Дзіма.

— Я ж незнарок.

— А я ў Баўгарыю лётаў, там цяпер амаль што Еўропа, — Дзіма забіў яшчэ два шары.

— А я ў Гішпаніі быў, — улез Лёха.

— "У цябе не пыталі,"— падумаў Ваня і ўрэзаў па карычневым.

— Ура!

— А казаў, што гуляць не ўмее, — падбадзёрыў Лёха.

— Як працуецца? — лупануў Ваня па сінім.

— Выдатна! Восем гадзін на дзень + сацыяльны пакет + бясплатная спортзала, — Дзіма працягваў забіваць шары.

— А я затое прыходжу на працу, калі захачу. Часу вольнага — куча, — пахваліўся Ваня.

— І што ты з ім робіш? — пацікавіўся Дзіма.

— Як што? — Ваня задумаўся, а што ён сапраўды робіць з вольным часам?

— Ну, чым ты захапляешся?

— Не ведаю. Ну як, у інтэрнэце сяджу, кніжкі там... чытаю. Ну, хобі адмысловага ў мяне няма.

— То бок маркі не збіраеш? — усміхнуўся Дзіма.

— Не.

"Што за лухта, якія яшчэ маркі?" — падумаў Ваня і бяздумна штурхнуў белы шар. Белы стукнуў сіні, сіні — жоўты, той адрыкашэціў У чорны, які стаяў акурат каля левай верхняй лузы.

— Уважлівей, бачыш, ты прайграў, — сказаў Дзіма.

Лёха пачаў гуляць партыю з Дзімам, а Ваню раптам стала так сумна. Ён тупа глядзеў на стол і на вычурныя позы сяброў. Тыя ненатуральна выгіналіся, дакладнымі ўдарамі заганялі шарыў лузы, каментуючы штосьці пра "вінты", "бакавікі", "цешчы" і "снукеры".

— Хлопцы, я пайду, мяне чакаюць, — схлусіў Ваня.

— Пакуль, — кінуў Лёха з-за стала, засяроджана цэлячыся ў чарговы шар.

Дзіма паціснуў млявую Ваневу далонь і сказаў, што варта б яшчэ сустрэцца.

— Ага, — аўтаматычна вымавіў Ваня.

Ён выйшаў з клуба і пайшоў нейкімі цёмнымі дварамі. Ішоў па гразі, а ў галаве круціліся шары, машыны, адпачынкі, зарплаты. Праз нейкі час ён выйшаў на праспект і пабачыў метро. Спусціўся.

На пероне людзі чакалі цягніка, а на *лаўцы* сядзела бабка ў цёплай зялёнай хустцы і зялёных рукавіцах. Ваня як паглядзеў на гэтыя рукавіцы, так і не здолеў вачэй адвесці. Знячэўку далонь бабкі выпрасталася, указальны палец крыху ссунуўся, а вялікі падняўся ўверх, і скрозь дзюрку ў рукавіцы Ваня ўбачыў падушачку вялікага пальца.

— Не заходзьце за абмежавальную лінію каля краю платформы, — папярэдзіў жаночы голас у дынаміках.

Ваня і не заўважаў раней, які гэта ласкавы голас.

— На пуцях метрапалітэна высокае напружанне, — пяшчотна працягваў голас.

Больш Ваня нічога не чуў. Ён падыйшоў да краю платформы і чорным шарам упаў на рэйкі.

**пераклаў Уладзь Лянкевіч**

# Ірына Барысевіч

## Калыханка

Калі неадрыўна ўзіраешся ў столь

І чытаеш "усё згублена".

Калі пачуваешся, нібы Каін

На сотым годзе выгнання.

Калі твой нясцерпны ўнутраны боль

Стаў злаякаснай пухлінай,

Якая болей не выцякае

З цябе слязамі да рання.

Калі цішыня разаб'ецца на ноты

Апошняй музыкі.

Калі на руцэ вышкрабаеш пазногцем

Чарговую баразну —

Нібыта ў маленстве,

забіся пад коўдру —

Ствары ілюзію,

Што ты не адна,

Што табе тут спакойна...

Імкніся заснуць.

Бо ранкам прачнешся свежай,

Пустой і сонечнай.

Бо ранак падобны да новай спробы

Прайсці узровень.

Ты будзеш на выстылай кухні паспешна

Давіцца яешняй,

Зноў адчуваючы сябе Асобай.

Абыякавай і здаровай.

## Апосталы

Дзяцінства глядзела захоплена, здзіўлена...

Хадзіць па вадзе захацела юнацтва:

Туды, дзе размыта, зацёрта, задымлена,

Ідэя вядзе за сабою дванаццаць.

Ім свецяць адбіткі

прапісанай ісціны,

Што, збіўшыся ў літары,

стала падманам.

Здаецца, крыху пратрымацца б ды выстаяць,

Каб быць ганаровым святым ветэранам.

Вада рэжа шклом ступні

іхнія босыя —

Далёка не факт, што ёй

стацца гаючай.

Даводзіцца брацца за новыя спосабы—

Абы не смяротна, абы не балюча.

Навучацца спрэс абыходзіцца вёсламі

Заместа няпэўных па хвалях паўкрокаў...

А потым апосталы стануць дарослымі,

Бацькамі ды хроснымі новых прарокаў.

## Думкі

У галаве гэтак пуста,

што кожнай народжанай думцы

вельмі самотна, тужліва

і страшна ўнутры.

Цераз замёрзлыя вочы

яна пазірае на вуліцу,

на светлафоры і стомленыя ліхтары.

Вось, узрываючы лужыну,

міма ляціць легкавушка —

думка выскоквае следам,

ледзь не ламае хрыбет,

хутка сядае ў машыну і,

раўнамерна пагушкваючыся,

едзе,

едзе,

едзе ўначы да цябе.

Мне б яе лёгкасць, свабоду і

беспакаранасць — я не хадзіла б адна

па заплаканых ходніках.

Там, дзе мне хочацца — я сустракала б

ранак, бавіла цэлыя содні...

Цела ня сцерці — няма спецыяльнай гумкі.

А выразаць з крывёю — не мне, алюча.

Можна толькі выношваць

бясшкодныя думкі і адпускаць.

І, каб не здзейсніліся,

не агучваць.

## Сублімацыя

Калі катуе і душыць цела —

Напэўна, варта разрэзаць вены.

Каб навучыцца хадзіць праз сцены,

Каб стаць тваім асабістым ценем,

Малочна-белым.

Смерць выпрабоўвае ўсе памеры,

Сцірае межы.

А свет навокал бліскуча-шэры.

Балюча рэжа...

Дарэмна зараз сюды прыйшоў ты—

Чакай у залі.

А свет навокал яскрава-жоўты,

І паліць, паліць!..

Апошні вечар з крыштальным звонам

Надзмецца й лопне.

А свет навокал — такі чырвоны —

Бруіць па кроплях.

# Кірыл Дубоўскі

## Надзейныя запляшнікі

Калі нахлыне пачуццё адзіноты, здаецца, што твае сябры — зусім не сябры, а звычайныя прыяцелі. Пра прыяцеляў раптам разумееш, што з імі ты проста п'еш разам. Разматваючы гэты клубок зялёнай нуды, прыходзіш да высновы, што тыя, з кім ты проста п'еш разам, — наогул невядома хто з іншага вымярэння, але ніяк не людзі з твайго жыцця.

Калі б не ўсе гэтыя думкі, што раптоўна нахлынулі на мяне, і не трывалае жаданне напіцца не аднаму, я б ніколі не апынуўся ля дзвярэй кампаніі НЗ — "Надзейны запляшнік". Фірма адкрылася зусім нядаўна і, як я зразумеў з рэкламы, магла даць мне ў арэнду годнага таварыша для асядлання зялёнага змія.

Вось таму я рашуча расчыніў шкляныя дзверы і зайшоў у памяшканне. Дзяўчына на рэсэпшане гасцінна мне заўсміхалася.

— Дзень добры, — сказаў я і крыху сцішыў голас. — Я тут упершыню і хацеў бы скарыстацца вашымі паслугамі.

Цудоўна, — яшчэ прыязней заўсміхалася Дзяўчына. — Зараз я вам крыху распавяду пра нашу кампанію. Мы прапаноўваем два віды паслуг. Па-першае, можам пазнаёміць вас з такім самым, як вы, кліентам шляхам параўнання анкет. Гэта будзе каштаваць танней, аднак стопрацэнтнага выніку, па зразумелых прычынах, мы гарантаваць не можам. Альбо вы заўсёды можаце звярнуцца да паслугаў аднаго з прафесіяналаў нашай фірмы, выбраўшы сабе тарыфны пакет. Пакет паслуг "Лёгкі" ўключае выпіўку ў рэстарацыі, дзе кожны плаціць сам за сябе. Пакет "Гасцявы" прадугледжвае больш задушэўную гутарку ў гасцях. Пакет "Усе свае" прапануе вам...

—Я зразумеў, — спыніў я яе. — Я не хачу прафесіянала. Хачу нармальнага жывога чалавека. Зможаце?

—Безумоўна. Толькі запоўніце спачатку вось гэтую анкету.

Я сеў за столік у куце і занёс ручку над паперай.

Спачатку мне давялося ўказаць улюбёныя алкагольныя напоі. Потым — іх аптымальную колькасць за адзін прысест. Ніжэй мне прапаноўвалі скончыць фразу "Калі я вып'ю, то раблюся..." Я крыху паразважаў і напісаў: "сентыментальным". У самым канцы трэба было пазначыць дадатковыя навыкі. Я паставіў мінусы насупраць "спяваць", "танчыць", "добра біцца" і плюсы насупраць "слухаць", "спачуваць", "даваць парады".

Дзяўчына-кансультант хутка занесла маю анкету ў кампутар.

—Зараз паглядзім, хто можа стаць для вас аптымальным партнёрам, — сказала яна, лёгенька застукаўшы пальцамі па клавіятуры.

Я сачыў позіркам за яе рукамі.

Такім чынам, — вымавіла яна нарэшце, — найлепшы кандыдат на сёняшні вечар для вас — гэта Павел, 34 гады, інжынер. У раздзеле "Пра сябе" Павел напісаў: "Люблю тэкілу, але магу і гарэлку". Вы абавязкова знойдзеце агульную мову. Зараз я звяжуся з Паўлам, і праз гадзіну ён будзе чакаць вас у бары "Дудакі" — у тым месцы, якое вы абодва пазначылі ў сваіх анкетах.

— Дзякуй, — сказаў я. — Спадзяюся, усё пройдзе добра.

— Безумоўна. Прыслаць вам яшчэ каго-небудзь раніцай?

— Не трэба, — адказаў я. — Не пахмяляюся.

Паўла я пазнаў па фотаздымку, які мне паказалі ў "Надзейным запляшніку". Ён сядзеў за стойкай бара і нешта казаў бармэну.

— Прывітанне, — сказаў я. — Вып'ем?

— Дзякуй Богу, ты прыйшоў! — адказаў Павел. — Замаўляй.

Я замовіў піва і мы стукнуліся.

— За знаёмства!

Павісла паўза.

— Ты раней ужо сустракаўся з запляшнікамі? — спытаўся Павел.

— Не, а ты?

— У мяне гэта таксама ўпершыню. Ты не падумай, я насамрэч нармальны, і сябры ў мяне ёсць. Ну, добрыя прыяцелі — дык дакладна.

— Ды і ў мяне таксама...

Пра што гаварыць, мы не вельмі разумелі. Не дзяліцца ж вось так з наскоку сваёю адзінотай [3] незнаёмым чалавекам. Мы замоўклі. Калі маўчаць зрабілася зусім няёмка, Павел зрабіў выкшталцоны ход.

— Як жа прыемна часам памаўчаць з добрым чалавекам, — сказаў ён. — Не адчуваеш сябе самотным, і ў той жа час у душу ніхто не лезе.

Я кіўнуў на знак згоды, і мы зноў замаўчалі.

— А можа, гарэлкі? — рашуча запытаўся праз пэўны час Павел.

Мы ўзялі гарэлкі і пачалі яе піць частымі чаркамі. Агульны занятак крыху зблізіў нас, таму Павел нарэшце адважыўся пачаць размову.

— А ведаеш, усе бабы — сукі!

— Чакай, — сказаў я. — А чаму толькі бабы?

— Таму што мы — нармальныя, — раптам пачаў усхліпваць ён. — Усё для іх робім, а яны нас кідаюць. Хоць на гэты раз я сам ёй здрадзіў...

Я зразумеў, што мой надзейны запляшнік напіўся. Потым Павел пачаў свой не вельмі звязны аповед пра іх з Марынай адносіны. Я слухаў яго, спачуваў і нават нешта раіў. Наогул, я і сам мог яму такіх жа, калі не лепшых, гісторый панарасказваць, ды калі нехта пачынае паводзіць сябе так, нібыта яму горш, чым мне, я адразу раблюся моцным, мудрым і спагадным. Асабліва пасля гарэлкі.

Канешне, гэта быў не адзіны мой самотны вечар. Але аддаваць яшчэ адзін у рукі аматараў я больш не хацеў. Я занадта высока цаніў сваю адзіноту. А таму папрасіў у НЗ даць мне на гэты раз прафесіянала. Тая самая дзяўчына працягнула мне каталог. "Надзвычай душэўны запляшнік Пётр складзе для вас незабыўную кампанію", — адкрыў я метадам тыка. "Класіка, брудэршафт, на разліве. Дасканалае валоданне антыпахмельнымі тэхнікамі!"

Я выбраў сабе Івана. У яго прапанове мяне ладкупіў запіс "Музыка на ваш густ". Тарыф вырашыў узяць "Гасцявы+". Бачыць чужых людзей у сябе дома не хацелася, а плюс заключаўся ў тым, што Іван наразаў халодныя закускі.

Іван адразу ж стварыў уражанне сапраўднага прафесіянала. Хоць я пазваніў у ягоныя дзверы на пяць хвілін раней прызначанага, ён сустрэў мяне прывітальным крыкам: "Штрафную да дна!". Каталог рэкамендаваў Івана як асабліва душэўнага запляшніка. У цяльняшцы і трэніках вусаты Іван і насамрэч выглядаў простым і добрым чалавекам.

Мы селі за стол. Іван разліў гарэлку. Я выпіў і закусіў кавалкам каўбасы.

— Ну, паміж першай і другой, як кажуць... — не марудзіў Іван.

Мы зноў выпілі. Мне захацелася паслухаць музыку.

— У цябя Дзепіш Мод ёсць? Ці М'юз які плаксівы? Што-небудзь для душы.

Іван крыху нахмурыўся.

— Ужо музыку? Яшчэ рана.

— Ну добра, — здаўся я. — Скажы, як час прыйдзе.

Іван забаўляў мяне анекдотамі, у асноўным пра Васілія Іванавіча і Пецьку, аднак адмачыў і пару непрыстойных штучак, па-змоўніцку мне падміргваючы.

— Ну, а цяпер і музыку можна, — сказаў ён, калі ў бутэльцы амаль нічога не засталося. Пасля чаго выйшаў з кухні, дзе мы сядзелі. Калі ён вярнуўся, на ягоных грудзях вісеў акардэон.

— Табе якая музыка падабаецца? Я што хочаш магу.

— А можа проста вып'ем? — спытаўся я асцярожна, каб не абразіць пачуццяў душэўнага сабутыльніка.

— Цяжка мне ўжо кожны дзень піць, — раптам паскардзіўся ён. — Сэрца ўжо нешта барахліць пачало. Я наогул на заводзе працую, а тут толькі падпрацоўваю...

Я чарговы раз падумаў пра якасць сервісу ў нашай краіне.

— Добра, я тады сабе налью, а ты зайграй.

Пакуль я дабіваў гарэлку, Іван меланхалічна разводзіў мяхі і перабіраў клавішы. Развіталіся мы цёпла, недаедзеную закуску ён сабраў у мяшочак і сунуў мне ў рукі.

— Чаго дабру прападаць, за ўсё ж уплочана.

Але калі да мяне зноў падкраўся смутак, я на гэты раз абыйшоўся без фірмы, а проста пазваў да сябе дадому ўсіх, каго называў сябрамі, прыяцелямі, і ўсіх, з кім

прoста часам выпіваў. Мы на славу напіліся і пачалі званіць у кампанію НЗ. Мы прасілі аператара перадаць Паўлу, што Марына абавязкова вернецца, а таксама патрабавалі, каб да нас прыехаў Іван з акардэонам, але той аказаўся на выездзе. Я прызнаваўся ўсім гасцям у тым, што люблю іх, казаў, якія яны блізкія і родныя, што я лічыў, нібыта яны мне не сябры, а на самой справе — яшчэ якія сябры. Мы разам ванітавалі з балкона, трымаючы адзін аднаго за плечы, спатыкаліся і падалі ў кватэры, шумелі, уключалі музыку, і ўсё гэтае шчасце было для ўсіх абсалютна бясплатным.

## Клон

Спачатку ўсё ішло добра. Андрэй кланіраваў жонку і цешыўся кампаніяй адразу дзвюх каханых жанчын. Адна хадзіла на працу, другая завіхалася па гаспадарцы. Штотыдзень мяняліся.

Праблемы пачаліся, калі ён захацеў легчы ў пасцель адразу з абедзвюма. Жонкі пачалі раўнаваць адна да адной і ледзь не пачалі бойку. "Дурніцы, — пачаў пераконваць Андрэй. — Ты — гэта яна, а яна — гэта ты. Я з вамі жанаты ў рэшце рэшт, усё па закону". Але жонкі заўпарціліся, і калі Андрэй быў з адною, другая ішла плакаць на кухню.

Калі адна жонка зацяжарала, а другая — не, у сям'і наспеў вялікі скандал. Цяжарная рыхтавалася быць маці і ўсё больш часу праводзіла дома і марыла пра дзіця. Да іншай жонкі ставілася крыху пагардліва. Апошняй Даводзілася затрымлівацца на працы, а першая зусім перастала туды хадзіць.

Адным не вельмі цудоўным днём другая жонка пайшла жыць да ягонага сябра. Андрэй насіўся па кватэры з нажом за першай. "Але ж я кахаю цябе, — заломвала яна рукі. — Чакаю тваё дзіця!" "Сука! — крычаў Андрэй. — Вы ж аднолькавыя, калі ён ёй так спадабаўся, то і ў табе гэта ёсць, прызнавайся!"

У рэшце рэшт ён кланіраваў сам сябе, прывёў дадому, пазнаёміў з жонкай і сказаў: "Ён будзе жыць з табою." Дастаў з кішэні пісталет і выстраліў сабе ў скроню.

## Апавяданні сярэдзіны вясны

## Сярэдзіна вясны

— Адсюль цудоўныя краявіды, — сказала Насця, калі яны з Дзімам залезлі на дах дванаццаціпавярховіка. — Я люблю сюды прыходзіць.

Дзіма паглядзеў уніз, і ў яго закружылася галава.

Я баюся вышыні, — сказаў ён, учапіўшыся рукамі ў парапет.

І я баюся. Але тут усё роўна файна.

Дзіма адышоў ад краю.

А на гэтыя дахі наогул можна лазіць? — спытаўся ён. — А раптам нам штраф дадуць?

— Хто?

— Ну, я не ведаю. Супрацоўнікі ЖЭСа, напрыклад, ці міліцыя. Нельга ж, напэўна, каб усё па дахах лазілі.

— Безумоўна, нельга. Бо так можна напалохаць Карлсана. Ён тады паляціць і не вернецца.

— Што?

— Я пажартавала.

— А-а-а...

Насця паглядзела на гадзіннік.

— Поўнач! Пятнаццатага красавіка прыйшло! Самая сярэдзіна вясны! Адчуй! Зараз так пахне момантам, сапраўдным момантам!

— Клеем?

— Дзіма, не смяшы мяне! Я магу незнарок пакаціцца ад смеху! Будзеш потым мой банцік ад асфальту адшкрабаць.

— Які банцік? У цябе ж кароткія валасы.

— Я жартую! Проста мне весела! Вясна!

— Мне трэба дадому, — сказаў Дзіма, — заўтра на працу з раніцы. Паперы важныя прыйдуць.

— А віно? Мы ж узялі віно, каб сярэдзіну вясны святкаваць.

Дзіма нахіліўся і дастаў з дыпламата пакет віна. Патрымаў яго ў руках, затым паставіў на парапет перад Насцяй.

— Я не буду, — сказаў ён, — забірай сабе. Сярэдзіна вясны — гэта крута, але мне насамрэч трэба ісці.

## Дзяўчына ў прыбіральні

Я нудзіўся ў чарзе ў платную прыбіральню і думаў пра тое, што яна ніколі не скончыцца. Перада мною стаялі два хлапцы. Па белых кашулях, запраўленых у чорныя штаны, востраносых бліскучых туфлях і асабліваму выразу твараў я пазнаў у іх банкаўскіх супрацоўнікаў. Хто-хто, а я з такімі тыпамі сутыкаўся. Адзін з іх пра нешта апавядаў іншаму:

— Я ёй кажу: пайшлі ў якую рэстарацыю прыстойную, я плачу. А яна мне: "Хачу на дах — і ўсё". Я з бабамі з інтэрнэту не першы раз сустракаюся, але гэтая зусім нейкая ненармальная. Ну я з ёю і палез...

Далей я не слухаў. Звычайная гісторыя двух людзей, якія вырашылі выпаўзці насустрач адзін аднаму, ды нешта не склалася. Колькі такіх сітуацый у мяне самога было!

Калі падышла чарга, я нагнуўся да акенца, працягваючы грошы, і ўбачыў дзяўчыну. Сказаць, што я быў ашаломлены, — нічога не сказаць. Дзяўчына ў акенцы была не

проста прыгожай, яна была прыўкраснай. Крыху бледны твар, цёмныя валасы і вялізныя зялёныя вочы. На грудзях вісеў бэджык з яе імем — Юля. Я забыўся, навошта прыйшоў, і стаяў, разявіўшы рот і перамінаючыся з нагі на нагу. Тым часам Юля працягнула руку з тонкім прыгожым запясцем і спрытна выцягнула з майго кулака 600 рублёў.

— Наступны, — сказала яна. Я прайшоў далей і ўжо спіною пачуў, як алкаш, што стаяў за мною, шчыра здзіўляўся: "Што такая красуня робіць у гэтай прыбіральні?"

Я выйшаў на вуліцу і паглядзеў на таблічку, дзе быў напісаны час працы ўстановы, і ўжо ў той самы вечар стаяў каля прыбіральні з букетам невядомых кветак, купленых у выпадковай бабулькі на выхадзе з метро.

Калі з'явілася Юля, я падышоў да яе і працягнуў кветкі. Яна прыняла букет без асаблівага здзіўлення і дазволіла себе праводзіць. Яна жыла непадалёку, і мы пайшлі пехатою па сухіх красавіцкіх вуліцах.

— Паслухайце, Юля. Я разумею, гэта, напэўна, вельмі недалікатнае пытанне, але тым не менш. Як вы здолелі знайсці такую працу? — нарэшце спытаўся я.

Яна адказала не адразу. Дастала з сумачкі цыгарэты, запаліла.

— Гэта ўсё размеркаванне. Я скончыла універсітэт, і мяне на два гады размеркавалі сюды адпрацоўваць грошы, якія патраціла дзяржава на маю адукацыю.

Я здзівіўся:

— А на якой спецыяльнасці вы вучыліся?

— Бюджэтаванне і кіраванне патокамі.

Я не ведаў, пра што яшчэ спытацца, і таму задаў зусім дурацкае пытанне:

— Вам падабаецца ваша праца?

— Нічога так, — адказала Юля, — я ўжо звыклася. Канечне, дах крыху зносіць. Уявіце: з раніцы да вечара прасядзець у прыбіральні. Але цярпець можна. Лепш, чым у чарнобыльскай зоне працаваць, ці ў вёсцы. Хоць часам здаецца, што маладосць так і пройдзе ўся ў прыбіральні. Цікава, праўда?

Я асмялеў:

— Можа, мы заўтра сходзім куды-небудзь разам? У кіно, напрыклад.

— Цудоўна! — узрадавалася Юля. — Я вельмі люблю фармат "Чатыры на чатыры". Заходзьце па мяне пасля працы.

Мы дамовіліся, што я абавязкова зайду, і развіталіся.

### Размова ля Свіслачы

— Што ты зараз робіш? — спытаўся Паша ў Косціка, калі скончыліся пары.

— Не ведаю.

— Ідзем піва піць?

— Давай, сёння бацькі як раз грошай падкінулі.

— Тады паехалі ў цэнтр.

На метро яны дабраліся да Нямігі, купілі піва і выйшлі да Свіслачы.

— Ну, давай за нас! — сказаў Паша. Косцік зрабіў некалькі глыткоў.

— Усё-ткі нармалёвае піва "Аліварыя", — сказаў Паша, закурваючы. — Адзінае з беларускіх, якое піць можна.

— Я не ведаю.

— Ну так, ты ж у нас зусім нядаўна піць пачаў.

— Спойваеш ты мяне.

— А хулі, трэба бухаць, пакуль малады, пакуль першы курс. Потым калі яшчэ пабухаеш?

— Я зараз лепш бы з дзяўчынай быў, чым бухаў.

Паша засмяяўся.

— Слухай, у цябе з бабамі зусім ніяк, ці што?

— Ніяк, — прызнаўся Косцік. — Сустракаўся з адной, калі мне яшчэ семнаццаць было. Яна мяне выратавала, можна сказаць. Паабяцай, што нікому не раскажаш...

— Ну ты мяне крыўдзіш, — абурыўся Паша.

— Я ў шаснаццаць год клятву сабе даў. Я быў тады такі ж адзінокі, як зараз. Карацей, я вырашыў, што калі да васемнаццаці год у мяне не будзе ніводнай дзяўчыны, то на свой дзень народзінаў я адкуль-небудзь саскочу. Ці мала высокіх дахаў? Яна якраз з'явілася, калі два месяцы заставалася.

— І ты, дэбіл, што, рэальна скочыў бы?

— Не ведаю, галоўнае, што нават думаць пра гэта не давялося.

— Ну і як яна?

— Яна файная была. Але мы з ёй проста цалаваліся. Потым праз месяц яна пераехала з бацькамі на Украіну. Мы яшчэ перапісваліся крыху.

— І што, з таго часу — нікога?

— Нікога.

— Бедалага.

Косцік адкрыў новую бутэльку.

— Сваякі жартуюць, што на мяне дзяўчаты вешаюцца. Прыходжу ў госці, і бабуля мною ганарыцца. Паўтарае пастаянна, што я высокі і прыгожы брунет. Ад дзяўчат адбіцца не магу, напэўна. А што я ёй скажу?

— Скажы, што ўсе дзяўчаты — у мяне, маленькага бландына.

Паша так гучна засмяяўся, што літаральна складваўся напалам. Косцік сумна пазіраў на яго. Паша і праўда быў значна меншага росту, аднак бландынам назваць яго можна было толькі з вялікай нацяжкай. Яго вала- сы былі нейкага бруднага саламянага колеру, нібыта нехта выцягнуў са стога шматок саломы. У Мінск Паша прыехаў вучыцца з Бабруйска. Косцік дрэнна ўяўляў, дзе гэта. І ўсё роўна з дзяўчатамі Паша меў куды больш прыязныя адносіны, чым ён, высокі брунет са сталіцы.

— Ведаеш, — сказаў Косцік. — Ёсць такі жарт: калі ў цябе няма дзяўчыны, значыць, у некага іх дзве.

— Не пераймайся, — сказаў Паша. — Яшчэ сустрэнеш сваю.

## У інтэрнаце

— Сёння ідзем у інтэрнат, — сказаў Паша Косціку на перапынку. — Пазнаёмлю цябе з бабамі. Можа, і западзеш на якую. Там і нармальныя ёсць.

Косця захваляваўся. Не кожны дзень выпадала яму знаёміцца з дзяўчатамі, а можа нават і ўразіць іх чым-небудзь. Рэшту дня ён правёў як на іголках, дакучаючы Пашы пытаннямі пра сённяшні вечар.

Па дарозе да студэнцкага інтэрната яны зайшлі ў краму. Паша купіў дзве бутэлькі гарэлкі і двухлітровы пакет апельсінавага соку.

— А віно браць будзем? — спытаўся Косцік.

— Не забывайся, куды ідзеш, — адказаў Паша.

— Гэта табе інтэрнат, а не рамантычная вячэра.

Яны зайшлі ў будынак і пакінулі студэнцкія білеты у вахцёркі, а потым падняліся на трэці паверх. У пакоі іх сустрэў хлопец у спартовых штанах і тапках. Хлопца звалі Лёха, гэта быў ягоны пакой. Лёха растлумачыў, што жыве з суседам-завучкам, і таму ў звычайны дзень пры ім не разгуляешся, але сення сусед нарэшце зваліў дадому і можна рабіць, што хочаш.

Лёха пайшоў пазваць дзевак. Паша тым часам выкладваў з заплечніка на стол гарэлку і сок.

— Яны што, праўда будуць гэта піць? — спытаўся Косцік.

— А куды яны дзенуцца? Ты што, тупы?

Вярнуўся Лёха. За ім у пакой зайшлі дзе дзяўчыны. Іх твары падаліся Косціку знаёмымі. Напэўна, бачыў ва ўніверы. Адна была вышэйшая, цёмнавалосая, уся нейкая вуглаватая. Другая — фарбаваная бландзінка з формамі. Не сказаць, каб прыгажуні, але нічога. Косця прыкінуў і вырашыў, што першая яму падабаецца

больш, і таму абрадаваўся, калі яна села побач з ім на ложак. Бландзінка прымасцілася побач з Пашам, Лёха сеў на крэсла.

Паша разліў гарэлку па шклянках. Косцік дадаў у сваю соку, астатнія не разбаўлялі.

— Ну, за сустрэчу! — сказаў Паша, і яны гучна стукнуліся.

Размаўлялі ні пра што. Абмяркоўвалі выкладчыкаў, нейкія даўно прамінулыя п'янкі, расказвалі анекдоты. Косцік згадаў дарэ- чы некалькі смешных гісторый, якія вычытаў У Інтэрнэце. Калі ён чарговы раз сказаў "Інтэрнэт", Лёха здзівіўся:

— Ты што, зусім адтуль не вылазіш?

— Косцік там з дзяўчынкамі знаёміцца, — сказаў Паша.

Косцік раззлаваўся. Па-першае, Паша сказаў гэта вельмі пагардліва, па-другое, яму не хацелася, каб дзяўчыны падумалі, нібыта ён яшчэ не знаёмы з усімі, хто яму патрэбен.

— Ды ідзі ты!..

— Фігня твой інтэрнэт, — гучна пачаў Паша.

— Не разумею, што ты там знайшоў. Я наогул не ведаю, што там і як, а ты зусім з глуздоў з'ехаў. Кажуць, там толькі самыя страшныя бабы сядзяць. Тыя, каго так ніхто не хоча. І яны там сабе мужыкоў шукаюць, бо іх ніхто не бачыць. А яшчэ там мужыкі сядзяць пад выглядам баб і такіх прыдуркаў, як ты, разводзяць. Кідай ты гэтую справу!

— Нічога не страшныя. Такія, як і паўсюль.

— Тады навошта табе гэты галімы комп? Толькі грошы і час адбірае.

— Ды ну цябе, нічога ты не разумееш.

Настрой у Косціка сапсаваўся. Ён павярнуўся да цёмнавалосай і паспрабаваў пачаць размову.

— Ты любіш чытаць?

— У школе не любіла, а зараз чытаю, што сябры даюць.

— Ааа. І што, напрыклад?

— Ну, Данцова там, Каэльё.

— Каэльё?

— Ага, я "Алхіміка" прачытала, мне вельмі спадабалася. Я лічу, што гэта вельмі мудрая кніга.

Косціка перасмыкнула.

— А музыку ты якую слухаеш?

— Я не вельмі музыку люблю, у асноўным слухаю радыё.

Косцік паглядзеў направа. Паша ўжо схапіў бландынку за каленка.

— А фільмы табе якія падабаюцца? — працягнуў Косцік.

— Розныя, камедыі ў асноўным.

Пра што пытацца далей, Косцік не ведаў.

— Пайшлі пакурым, — сказаў яму Паша, падымаючыся з ложка.

Яны выйшлі на калідор і запалілі цыгаркі.

— Ты ведаеш, у чым твая праблема? — спытаўся Паша, гледзячы Косціку ў вочы.

— Ну скажы.

— У тым, што замест таго каб проста паспрабаваць выябаць дзеўку, ты стараешся спачатку выябаць ёй мазгі. Нахер табе ведаць, якую яна музыку слухае, якія фільмы глядзіць, якія кнігі чытае? У цябе што, не стаіць без усёй гэтай хуйні?

— Ды ладна табе, — прамармытаў Косцік.

— Прасцейшым трэба быць, разумееш? Прасцейшым.

— Паспрабую, — паабяцаў Косцік і яны вярнуліся ў пакой.

### Вочы

— Прыкінь, я ўчора па мордзе атрымаў ад сяброўкі, — паскардзіўся Ваня і пачасаў шчаку.

— Ад якой яшчэ сяброўкі?

— Ты яе не ведаеш. Мы з ёй проста сябруем, у кіно ходзім. Размаўляем. У яе нават нехта ёсць, напэўна. Мы сядзелі ўчора на лаўцы, віно пілі. Вясна там, сонейка, птушкі. Раздавілі ўжо пакет на дваіх, і тут бачу я — а ў яе позірк такі асаблівы. Нібыта хоча, каб я яе абняў. Ну ты ж ведаеш, я заўсёды па вачах бачу, калі дзеўкі гэтага хочуць. Ні разу не памыліўся. Ну і палез я да яе з рукамі, а яна мне як заляпіла...

Ваня зноў памацаў шчаку.

— Я калі зараз думаю, што ж гэта наогул было, то разумею, што вочы ў яе проста касыя былі. Звычайны п'яны позірк. І ў тых, што да яе, — таксама. Бухія яны ўсе былі. Проста мне шанцавала.

### Па кнігі

— Заходзь, — сказала Ліза. — Можаш не разбувацца, у нас рамонт.

Дзіма асцярожна пераступіў парог.

— Пайшлі ў мой пакой. Хаця і там не вельмі.

У пакоі Дзіма агледзеўся. Канапа ў куце была накрытая поліэтыленавай плёнкай з белымі разводамі, на акне не было фіранак. У голай празрыстасці шкла было нешта настолькі няўтульнае, што Дзіма паморшчыўся. Пустая шафа ля сцяны была расчынена, побач на падлозе валяліся кнігі.

— Што я табе павінна аддаць, кажаш? — спыталася Ліза.

— Каэльё і Муракамі.

— А, ну так!

— Дарэчы, як табе?

— Нармальна. Праўда, нічога асаблівага.

— А мне спадабалася, — сказаў Дзіма. — Вельмі лёгка чытаецца. Ведаеш, пасля працы мазгі зусім не вараць, не кожная кніжка падыйдзе.

— Ну так. А ты па-ранейшаму ўвесь у працы?

— Не пачынай.

— Ды я так. Цяпер ужо якая розніца?

— Яны замоўклі.

— Чым зараз займаешся? — спытаўся Дзіма.

— Ды нічым асаблівым. На шэйпінг хіба што запісалася, хачу добра выглядаць.

Дзіма паглядзеў на Лізіны абцягнутыя блузкай грудзі. "Як ні круці, — раптам падумаў ён, — калісьці я дакранаўся да гэтых грудзей, падабаецца ёй гэта або не". Потым ён пачаў думаць, што чалавечая скура пастаянна абнаўляецца і, напэўна, у Лізы ўжо зусім іншыя грудзі, а тыя, што былі, больш не існуюць. І што наогул ніводзін міліметр Лізінага цела больш нічым не звязаны з ім. Яму зрабілася сумна.

— Пра што задумаўся? — спыталася Ліза.

— Ды так. Дарма мы ўсё ж расталіся. Ты была самай лепшай. Навокал зараз адны вар'яткі. На дахі цягаюць, хочуць невядома чаго.

— Ты паскардзіцца мне прыйшоў?

— Прабач.

— Не бядуй, яшчэ сустрэнеш сваю. На мне свет клінам не сышоўся.

## Сябры

Косцік і Паша дапівалі чарговую бутэльку піва ў Косціка дома на кухні.

— Пайшлі пакурым, прапанаваў Паша, — і яны з бутэлькамі ў руках выйшлі ў пад'езд да смеццепровада.

— Мне ўжо добра, — прызнаўся Косцік і пахіснуўся.

— Дык і не павінна быць дрэнна, — засмяяўся Паша. — Глядзі толькі не наклюкайся зноў, як у інтэрнаце.

— Ну колькі ўжо можна нагадваць?..

— Ну а што? Як налёг тады на гарэлку, дык ледзь я цябе потым да хаты дацягнуў.

— Ай!..

Паша зацягнуўся і агледзеўся.

— Часам здаецца, што каля гэтага смеццепровада ўся маладосць і пройдзе, — пажартаваў ён.

— Добра, што ты да мяне часта заходзіш, — адказаў Косцік. — Мы ж сябры.

— Так, сябры. І ведаеш, ніводная баба сяброў табе не заменіць.

— Ага.

— Ну сам мяркуй, ці зможаш ты калі-небудзь нармалёва пабухаць з бабай?

— Не, — згадзіўся Косцік.

— А ці ж баба зразумее цябе так добра, як сябар?

— Мабыць, не.

— Ну вось бачыш...

Паша схіліўся да Косцікавага вуха:

— Я табе больш скажу: бабы — гэта зло, а ўсё зло — ад баб. Галоўнае — сябры.

— Я згодзен, — сказаў Косцік. Яму зрабілаяся раптам вельмі добра. Добра і лёгка.

— Правільна, ну гэтых баб. Давай лепш вып'ем за сяброў.

### Тры рэчы

— Мяне цікавяць тры рэчы, — адказала яна на маё прывітанне ў асьцы. — Якога ты росту? Ці вялікі ў цябе жывот? Ці ёсць на тваёй галаве хоць якая раслiннасць? Калі адкажаш правільна на ўсе тры пытанні, у цябе будуць вялікія шанцы на знаёмства са мною. І ніяк інакш.

Я здзівіўся. Пачатак нашай размовы быў вельмі незвычайным.

— Ты пра гэта ва ўсіх пытаешся? Я сярэдняга росту, дзесьці метр семдзесят восем, жывот у мяне зусім звычайны, а на галаве ёсць валасы, праўда, даўно не стрыжаныя. Але ж гэта нам не перашкодзіць?

— Усё выдатна, хлопчык! Ты — проста бальзам на маю душу. Навокал адны маленькія, лысыя, пузатыя вычварэнцы. Спадзяюся, ты мне не хлусіш.

Так мы з ёю і пазнаёміліся. У той жа самы вечар мы вырашылі ўбачыцца і дамовіліся сустрэцца каля нулявога кіламетра.

Яе звалі Насця, мы бадзяліся з ёю па цёплых вуліцах і пра нешта гутарылі.

— Нешта мы ўсё кругамі ходзім, — сказала яна раптам. — Ты хочаш закружыць мне галаву?

Так шпацыруючы, мы падышлі да "Белай вежы".

— Пачынаем лічыць, — сказала Насця. — Вось глядзі: адзін, другі, трэці, чацвёрты...

— Хто?

— Ну як гэта хто? Пытанні ў цябе. Маленькія, лысыя вычварэнцы. Тут іх натуральны арэол існавання, тут іх цэлыя статкі. Кыш! Кыш! — раптам замахала рукамі Насця.

Я ашалела глядзеў на яе.

— Ну добра, пайшлі далей. Усё роўна яны нікуды адсюль не падзенуцца, дарма толькі нервы трапаць з імі.

— А можа, яны ўсё ж разбегліся б?

— Не, ты што. Ёсць такія рэчы, якіх ты не можаш змяніць. Гэтым светам кіруе нешта нізкае, пражорлівае і пачварнае — гэта аснова. Ты яе ніяк не зрушыш, колькі вецер ні ганяй.

Мы дайшлі да нейкай лаўкі.

— Давай пасядзім, — сказала Насця.

Мы селі.

— Выпіць было б нядрэнна, — сказаў я раптам.

— У мяне ёсць, — адказала Насця. Яна расшпіліла свой заплечнік і дастала адтуль пакет віна.

— Ого, — здзівіўся я. — Ты да ўсіх так на першае спатканне прыходзіш?

— Не, ты што. Проста так атрымалася.

Мы адкрылі пакет і пачалі піць віно.

— Глядзі, яны не рухаюцца! — раптам паказала Насця пальцам на неба.

— Хто?

— Хмары. Яны стаяць на месцы. Чаму?

Можа, іх проста нічога не кранае?

Насця засмяялася.

— Можа. А давай на іх дзьмуць. Раптам яны зрушацца з месца?

— Давай.

Мы набралі ў лёгкія паветра і пачалі дзьмуць на хмары.

## Бацькі

Косцік і Паша разам са сваімі аднагрупнікамі Сяргеем і Віцем сядзелі і пілі піва.

— Ну, давайце за нас, — падняў Паша ўверх бутэльку "Крыніцы".

Яны ў чатырох стукнуліся. Косцік глынуў.

— Вось што дзіўна, — сказаў ён. — Я раней зусім нічога не піў, а зараз — амаль кожны дзень. Я нават ужо не ведаю, ці то я заўсёды напіваюся, ці проста часам цверазею. Раблю першы глыток і разумею: я вярнуўся.

— Куды? — спытаўся Паша.

— Не ведаю. Нібыта аднекуль пайшоў, а цяпер вярнуўся. Вечары — як у тумане нейкім. І раніцай, ведаеш, прасветлена так.

— Ну ты даеш, — сказаў Сяргей. — Цябе гэта напружвае, ці што?

— Не ведаю. Так можна ўсё на свеце прапіць.

— А што яшчэ рабіць у гэтым жыцці?

— Не ведаю, ёсць, напэўна, у жыцці нейкі сэнс.

— Ніякага сэнсу ў жыцці няма, — сказаў Віця.

— Тады чаму ты самагубствам жыццё не скончыш? — спытаўся Паша.

Віця задумаўся:

— Напэўна, з-за бацькоў. Для іх жа гэта будзе гора.

— Ну так, — сказаў Сяргей. — Я таксама жыву толькі з-за бацькоў. А інакш навошта?

— Добра, — сказаў Паша. — Раз вы такія разумныя, то давайце вып'ем за бацькоў.

— Давайце нап'емся за бацькоў, — прапанаваў Косцік.

І яны напіліся.

## Проста

Косцік і Ліза сядзелі на лаўцы перад універам і моўчкі курылі. Толькі што яны правалілі залік па вышэйшай матэматыцы і цяпер з тугою глядзелі на дванаццаціпавярховы будынак альма-матэр.

Ліза кінула тонкі фільтр у сметніцу і пацягнулася па новую цыгарэту.

— Я на выходныя дадому хацела паехаць, а зараз давядзецца ўсё па-новаму вучыць. І цяпер жа ўжо не спішаш.

— А я ўсё роўна спісваць ніколі не ўмеў, — прызнаўся Косцік. — Крыўдна, што адны мы з усёй групы не здалі.

— Вось табе і майскія святы. Як дура, буду сядзець у чатырох сценах з інтэграламі, пакуль усе гуляць будуць.

— А мне дык і гуляць не вельмі хочацца. Нейкая мутная вясна ў гэтым годзе. Чакаеш нечага вечна, чакаеш, спадзяешся...

— Ай, і не кажы...

Косцік задраў галаву ўверх і зацягнуўся.

— Мне дык наогул часам хочацца з даха нашага ўнівера скочыць, — сказаў ён.

— Я таксама пра гэта думала, — здзіўлена адказала Ліза. — А вось табе чаму хочацца?

Косцік задумаўся. Што ёй адказаць? Прызнацца, што самотны? Што адчувае сябе няўдачнікам па жыцці? Ды яшчэ і гэты залік правалены...

— Ну... вось хочацца часам проста так. А табе?

— І мне проста так, — сказала Ліза.

І яны засмяяліся.

## Добры раман

Кажуць, што кожны чалавек здольны напісаць адзін добры раман — пра сваё жыццё. Сяржук верыў, што адзін добры раман можна раздзяляць на шмат добрых апавяданняў і што так будзе нават і лепш.

Пісаць ён пачаў яшчэ ў школе. Гэтаму нямала паспрыяла класная насценгазета, у якой маглі надрукаваць кожнага, хто захоча. Аднак канкурэнцыя сярод школьнікаў была такой вар'яцкай, што трапіць са сваімі вершычкамі ці апавяданнечкамі на шырокую старонку насценгазеты лічылася вялікім поспехам.

Першае напісанае ім апавяданне называлася "Пазыкі". У ім ён едкай сатырай кляйміў свайго аднакласніка, які паўгода назад пазычыў у Сяржука рубель і дагэтуль не аддаў. Калі ён прынёс апавяданне настаўніцы літаратуры і, па-сумяшчальніцтву, галоўнаму рэдактару на сценгазеты, тая прачытала яго на месцы і вынесла суровы прысуд: не падыходзіць.

— Сяргейка, — сказала яна, — гэта добра, што ты таксама ўзяўся за пяро, але тэма твайго апавядання занадта дробязная, яна не будзе цікавай іншым. Ты б павучыўся, напрыклад, у Марыйкі. Пачытай яе апошні вершык пра тое, як добра нам усім вучыцца ў школе. Вось як трэба пісаць!

Занадта дробязная! Як жа так? Можа, для настаўніцы рубель — гэта дробязь, але для Сержука гэта былі вялікія грошы, ён доўга перажываў сваю страту. А тут

высвятляецца, што Пецька, які, можна сказаць, разарыў яго, не зрабіў нічога асаблівага, што гэты найбрыдотнейшы ўчынак, які так глыбока раніў Сержука, нават не заслугоўвае таго, каб пра яго пісалі. Пра што ж тады пісаць?

Пра каханне! Цяпер ён павінен напісаць пра каханне, Сяржук гэта добра разумеў. Якім жа ён быў смешным, калі прынёс настаўніцы тое недарэчнае апавяданне пра рубель. Але цяпер ён пасталеў, змяніўся. Яго хвалююць іншыя тэмы. Прыйшоў час напісаць пра каханне паміж мужчынам і жанчынай.

Сяргейка! Гэта добра, што ты пераключыўся на дарослыя тэмы, усё-ткі ты зараз адзінаццацікласнік. Але ў перажываннях твайго героя няма нічога новага. Гэта бывала з усімі і ўжо даўно апісана ў літаратуры, і не толькі класікамі, але і тваёй аднакласніцай Марыкай, якая напісала на гэтую тэму проста выдатны вершык. Вельмі раю прачытаць!

Зноў не пацэліў! Што ж гэта такое? Кожны вечар ён засынаў і прачынаўся з думкай пра Яе, і гэтыя думкі не пакідалі яго ўвесь дзень. Ён выказаў іх у сваім апавяданні, напісаў шчыра, як толькі мог, а гэта аказалася не новым. Не новым і не цікавым. Але што ж тады новае?

Эратычная проза. Дабротная прыгожая эратычная проза. Да таго ж, досвед, дзякуй богу, ужо быў, хай сабе і невялікі. У лютым, на сустрэчы выпускнікоў, Сяржук не без прыемнасці авалодаў у ванным пакоі чырвонай ад віна Марыйкай. Калі яны потым сядзелі на кухні і палілі, Сяржук гадаў, ці знойдзецца месца гэтай выпадковай сувязі ў чарговым Марыйчыным вершы. У яго апавяданні — дакладна знойдзецца.

"Сяргей! Вымушаны паведаміць вам, што дасланае вамі апавяданне "Каханне ў ванным пакоі" па многіх прычынах нам не падыходзіць, нягледзячы на тое што наш часопіс спецыялізуецца на эратычнай прозе. Адчуваецца, што жыццёвы досвед аўтара вельмі малы, а ў апісанні акта кахання няма нічога яркага і арыгінальнага, што магло б зацікавіць чытача. Паспрабуйце яшчэ! З павагай, галоўны рэдактар".

Не арыгінальна і не нова. Ну колькі ж можна? Зрэшты, Сяржук не пакідаў надзеі надрукаваць сваю прозу ў Інтэрнэт-выданнях, часам нават і даволі падазроных. З аднаго з такіх сайтаў яму аднойчы прыйшоў адказ адным радком: "Тэма цыцак раскрытая недастаткова". Пасля гэтага Сяржук пачаў больш асцярожна выбіраць месцы магчымых публікацый.

Але яго не друкавалі. Ён пісаў пра сябе, пра тое, што бачыць навокал, але адмовы сыпаліся адна за адной. Ніхто не хацеў браць нават слёзнае апавяданне пра суседскую дзяўчынку, якая захварэла на рак і цудам вылечылася. Сяржук меркаваў, што калі б дзяўчынка у рэшце рэшт памёрла, яго апавяданне мела б больш шанцаў на посех, але хлусіць не хацеў. Ён пісаў праўду.

"Кожны чалавек здольны напісаць адзін добры раман — пра сваё жыццё". Ага, зараз! Каму яно патрэбна — тваё жыццё, калі ты — просты хлопец? Тваё жыццё апісалі класікі яшчэ ў дзевятнаццатым стагодцзі, і тое ўжо толькі тую частку, якая дасталася ім ад Пушкіна ў васемнаццатым. І што зараз рабіць?

Забіць сябе! Але не проста забіць. Ён жыў проста, а памрэ прыгожа. Павесіцца, атруціцца, падраць вены — гэта для тых, хто не здольны нічога выдумаць. А ён — асоба творчая, апісваў жыццё на мяжы тысячагодцзяў. Ну што ж, не прыйшоў яшчэ, напэўна, ягоны час. Але ўжо хутка. Што б такое выбраць? Мурашнік. Ён распранецца і ляжа на мурашнік. Выдатная смерць, вартая сапраўднага творцы. Так ён і зробіць. Бывайце!

*"Цела дваццацічатырохгадовага Сяргея Іванова знайшлі ў прыгарадным лесе пасярод вялізнага мурашніка. Мяркуючы па цыдулцы, якую ён пакінуў, такім няпростым спосабам малады чалавек вырашыў здзейсніць самагубства. Нагадаем, што гэта ўжо пяты выпадак самагубства пры дапамозе мурашніка за апошнія два месяцы".*

## Новы экзамен

1

Я дагэтуль успамінаю той дзень, шэсць год назад, калі дэкан нашага факультэта з вялікай сіняй папкай у руках увайшоў у нашу аўдыторыю.

— Дзень добры, дзеці, — сказаў ён нам, тады яшчэ першакурснікам. — У мяне для вас цікавыя навіны.

Па партах праляцеў ледзь чутны гул, група захвалявалася. Дэкан паднёс руку да рота і адкашляўся.

— Я прыйшоў, каб паведаміць вам пра новую ініцыятыву нашага міністэрства адукацыі. Скажу шчыра: яна крыху... эээ... незвычайная.

Я паглядзеў на аднагрупніка Воўку Іваненка. Ён паціснуў плячыма і адвярнуўся. Дэкан тым часам працягваў:

— З гэтага семестра ва ўсіх вышэйшых навучальных установах нашай краіны ўводзіцца новы экзамен.

— Магчыма, вы хацелі сказаць "новы курс", Павел Ігаравіч? — запытала выкладчыца вышэйшай матэматыкі, якая дагэтуль сціпла стаяла ля падаконніка з крэйдаю ў руцэ.

— Не, не новы курс. Менавіта новы экзамен.

Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны? — пажартаваў з апошняй парты Паўлюк Букін. Дэкан кінуў на яго грозны позірк і Паўлюк уцягнуў галаву ў плечы.

— Магчыма, гэты экзамен падасца вам вельмі простым і нават вясёлым. Але не забывайце, што здаваць яго вам давядзецца пасля кожнага семестра ўсе пяць год вашага навучання. Выніковы сярэдні бал будзе зафіксаваны ў вашым дыпломе аб вышэйшай адукацыі. Акрамя таго, гэты сярэдні бал стане важным крытэрам для працаўладкавання.

Мы сядзелі і прыслухоўваліся да кожнага слова. Дэкан зноў адкашляўся.

— Але, дзеці, не буду вас мучыць. Гаворка ідзе пра экзамен на шчаслівасць.

Група збянтэжана маўчала. Дэкан зазірнуў у сваю папку.

— Па ініцыятыве кіраўніцтва нашай краіны і міністэрства адукацыі, з гэтага года вышэйшыя навучальныя ўстановы будуць ацэньваць не толькі веды, але таксама і прыроджаныя здольнасці. Гэта патрэбна дзеля таго, каб выявіць сярод вас тых, каму ад прыроды шанцуе больш або менш за астатніх. Многія салідныя кампаніі хочуць браць на працу толькі тых людзей, якім у жыцці спадарожнічае поспех. Адпаведна тым з вас, каму поспех у жыцці не спадарожнічае, давядзецца шмат і старанна працаваць, каб мець магчымасць канкурыраваць на рынку працы. Ці ёсць пытанні?

— Павел Ігаравіч, — гэта зноў была выкладчыца вышэйшай матэматыкі, — а як жа будзе праходзіць гэты экзамен?

Добра, слухайце. Студэнты будуць па адным заходзіць у аўдыторыю і выцягваць сабе перад экзаменацыйнай камісіяй адзнаку ад нуля да дзесяці. Не білет, а адразу адзнаку. Зразумела? Дэкан агледзеў нашу групу. — Калі пытанняў больш няма, то я пайду. З гэтага дня ўсё і пачалося.

2

У раскладзе экзаменаў выпрабаванне на шчаслівасць стаяла ў самым канцы. На той момант мы ўжо здалі астанія дысцыпліны і ўсхвалявана тоўпіліся перад зачыненымі дзвярыма.

Першай захацела пайсці Марыйка Лакіна. Перад тым, як зайсці, яна ўзялася за ручку і на імгненне застыла. А потым рашуча расчыніла дзверы і знікла ў аўдыторыі.

— Зараз паглядзім, наколькі шчаслівая Марыйка, — пракаментаваў Паўлюк Букін, — калі што — абавязкова ажанюся!

Праз хвіліну Марыйка выйшла.

— Дзесяць!

Мы ахнулі.

— Я наступны! — крыкнуў Паўлюк Букін і знік за дзвярыма. Вярнуўся ён ужо з дзевяткай. За ім хынулі і астатнія.

Я пайшоў дзесьці ў сярэдзіне. Да таго часу маім аднагрупнікам шанцавала, меней за шасцёрку ніхто не выцягнуў.

Павернутыя тыльным бокам лісцікі з адзнакамі радамі ляжалі на стале перад экзаменацыйнай камісіяй, на чале якой сядзеў сам дэкан. Я занёс руку над сталом і прыслухаўся да адчуванняў. Я ведаў, што мая адзнака абавязкова сябе акажа. Калі мне падалося, што ў руку нібы закалола, я схапіў найбліжэйшы лісцік і перавярнуў яго. На адваротным баку стаяў чорны, тлусты нуль.

— Як вы разумееце, пераздачы быць не можа, — сказаў мне дэкан. — Гэтая адзнака будзе залічана і паўплывае на ваш выніковы бал.

Засмучаны, я выйшаў у калідор.

Па сканчэнні экзамена высветлілася, што завалілі яго толькі я і Вольгачка Шчасная. Нам ніхто нічога не сказаў, аднак мне падалося, што ў вачах нашых аднагрупнікаў мы сталі кімсьці накшталт заразна хворых.

Калі ўсе пачалі абмяркоўваць, як і дзе будуць адзначаць паспяховае завяршэнне сесіі, я падыйшоў да Вольгачкі і стаў побач.

— Не бяры да галавы, Волька, — сказаў я. — Нічога страшнага не адбылося.

Яна падняла вочы. Яны былі поўныя слёз.

— Мне заўсёды не шанцуе, — усхліпнула Вольгачка. — Я думала, каб хоць адзін бал ці два, а тут...

Яна закрыла твар рукамі.

— Не перажывай, вучоба — не галоўнае, — сказаў я і тут жа адчуў усю недарэчнасць сваіх слоў.

— Вольгачка глуха заплакала.

3

У той вечар мы гулялі з Вольгачкай адны паначным горадзе. Блукалі па вузкіх вулках, не звяртаючы ўвагі на тое, што з неба валіў мокры снег, пакуль, нарэшце, не набрылі на маленькую кавярню. Там мы селі за столік і зазірнулі ў меню.

— Дзвесце шаснаццаць гатункаў кавы, звар'яцець можна! — узрадавалася Вольгачка.

Да нас падыйшла афіцыянтка з нататнікам у руцэ.

— Чорную без цукру, — папрасіў я.

Афіцыянтка чыркнула ў сваім нататніку.

— І яшчэ йеменскі гатунак "Аль-Маха", калі ласка, — выбрала Вольгачка.

Афіцыянтка вінавата ўсміхнулася.

— Прабачце, "Аль-Маха" толькі што скончыўся, мне вельмі прыкра.

— Ну тады таксама чорную без цукру.

Вольгачка адкінулася на спінку невялічкай канапы.

— Вось бачыш, — сказала яна. — Мне ніколі не шанцуе. Экзамен толькі пацвердзіў гэта. Праўда, раней пра гэта ніхто не ведаў, гэта было неістотна, а зараз пра маю няўдачлівасць даведаюцца ўсе.

— Мне здаецца, ты дарма так перажываеш. Гэты экзамен нічога нам не дадаў і нічога не адняў, мы засталіся такімі ж, як і раней. Усё нармалёва.

— Не, — сказала Вольгачка. — Не ўсё нармалёва.

4

Аказалася, што яна мела рацыю. Пасля таго, як мы атрымалі калы па шчаслівасць і ў другім семестры, нашы аднагрупнікі стараліся абыходзіць нас бокам. І хоць яны па-ранейшаму заставаліся змушана ветлівымі, мець з намі агульныя справы неяк баяліся.

У трэцім семестры мы з Вольгачкай упэўнена выцягнулі па тройцы і ўзбадзёрыліся, ды ўжо ў чацвёртым нам давялося задаволіцца двойкамі.

Аднойчы я паспрабаваў схітрыць на экзамене — занёс руку над лісцікамі з адзнакамі, дачакаўся звыклых іголачак у далоні, але лісцік схапіў з супрацьлеглага боку стала. Ды гэта не дапамагло, у маёй руцэ аказаўся здрадніцкі кол.

Нашыя аднагрупнікі ішлі ў асноўным роўна — шэсць-сем балаў, толькі Марыйка Лакіна ды Паўлюк Букін атрымлівалі адны дзевяткі і дзесяткі. Паўлюк, як і абяцаў, ажаніўся з Марыйкай. Яны нават не сталі чакаць заканчэння вучобы.

Мы з Вольгачкай таксама пачалі думаць пра вяселле. Наша катастрафічная нешчаслівасць нас вельмі зблізіла.

Тым часам у краіне пачаў зараджацца рух няўдачнікаў. Яны патрабавалі адмены новаўведзенага экзамену, аргументуючы гэта недапушчальнасцю штучнага раздзялення на ўдачлівых і няўдачлівых. Але іх пратэст аказаўся няўдалым, паступова рэгулярнае тэсціраванне на шчаслівасць стала абаязковым для ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў, а потым і прыватных фірм. Ніхто не хацеў бачыць у сябе супрацоўнікаў, няздольных прыцягнуць хоць які-небудзь невялічкі поспех. Павялічылася беспрацоўе.

Многія праблемы да пары не датычыліся нас з Вольгачкай, аднак пяць год навучання прамінулі непрыкметна і надыйшоў той момант, калі нашай групе далі дыпломы з выніковымі адзнакамі па ўсіх дысцыплінах.

У тым ліку і па шчаслівасці.

5

Той дзень, шэсць год назад, змяніў маё жыццё. Што такое беспрацоўе, я цяпер зведаў на ўласнай скуры. Ніводная фірма не жадае бачыць мяне сваім супрацоўнікам, і вінаваты ў гэтым, натуральна, сярэдні бал па шчаслівасці — адзін з паловай. Некаторыя дырэктары, здаралася, праяўлялі ў адносінах да мяне міласэрнасць і згаджаліся не зважаць на мае няўдачы падчас навучання, але толькі пры ўмове, што я выцягну сабе прымальны бал на іх вачах. Ці трэба казаць, што нічога добрага з гэтага не атрымлівалася.

З цягам часу мы з Вольгачкай пераехалі жыць у спецыяльны для такіх, як мы, квартал. Харчуемся і апранаемся на матэрыяльную дапамогу. Чакаем дзіця і часта фантазіруем, на каго яно будзе падобнае. Кажуць, гены перадаюцца праз пакаленне. Мы на гэта вельмі спадзяемся. А раптам нам пашчасціць?

## Героі

...Яна з'явілася непрыкметна. Падыйшла да мяне са спіны, далікатна дакранулася да пляча.

— Прывітанне.

— Дзень добры, Вераніка, — азірнуўся я. — Чым магу служыць?

— Ты сам ведаеш...

Яна апусціла вочы. У іх куточках збіраліся першыя слязінкі.

— Нават не здагадваюся. Ну давай, выкладвай, што там у цябе.

Вераніка сціснула пераплеценыя пальцы. Наманікюраныя пазногцікі ўпіліся ў скуру.

— Ты хочаш, каб мы з Янкам расталіся!

— Крый Божа, Вераніка! Зусім я гэтага не хачу.

— Але ж мы павінны растацца, так?

— Толькі таму, што ты здараджваеш яму.

Вераніка пачырванела. Я працягнуў:

— Час ужо Янку здагадацца. Хіба ты не ведаеш, што ўсё тайнае становіцца яўным?

— Але ж ты можаш зрабіць так, каб ён не даведаўся...

— Канечне магу, — пагадзіўся я. — Але гэта будзе выглядаць фальшыва, і мне ніхто не паверыць. Ты мая ўлюбёная гераіня менавіта таму, што ты такая сапраўдная.

І чаму мне толькі рэаліст дастаўся, — уздыхнула Вераніка. — Ну ты ж вельмі проста мог бы быць рамантыкам. Вось у Светкі пісьменнік — рамантык. І ўяе такое каханне...

— А яшчэ я мог бы быць постмадэрністам. Я б табе такое каханне паказаў... Паўгода ты шчасліва жыла з Янкам, навошта табе быў патрэбен гэты Аляксей?

— Мне? — здзівілася Вераніка. — А навопгга ён з'явіўся ў трэцім раздзеле?

— Гэта другарадны персанаж, ты не павінна была звяртаць на яго ўвагі.

— А можа, ты сам гэта ўсё зрабіў для развіцця сюжэта? Вам, пісьменнікам, наогул напляваць на лёс сваіх герояў, пакрэмзаеце, як хочацца, абы чыталася цікава. Калі нехта шчаслівы, то вам гэта не падабаецца, вам гэта сумна. А нам што рабіць?

Я задумаўся.

— Мне падаецца, Вераніка, ты павінна разабрацца, хто табе патрэбен. Калі ты будзеш кідацца на кожнага выдуманага мною хлопца, то шчаслівай не будзеш. Мая віна, я стварыў цябе занадта палкай, але калі ты зможаш трымаць сябе ў руках, то Янка ні пра што не даведаецца.

— Я паспрабую.

— Вось і дамовіліся, можаш быць спакойнай.

Вераніка знікла так сама незаўважна, як і з'явілася. А я сеў за стол і ўключыў кампутар. Пад рытмічны стук клавішаў Аляксей пераехаў у іншы горад, дзе ў хуткім часе ажаніўся са створанай для яго дзяўчынай. Для Веранікі з Янкам я напісаў рамантычны вечар, такі, што не горш, як у Светкі.

Я хачу, каб усе былі шчаслівымі.

**пераклала Наталья Давыдоўская**

## Наста Манцэвіч

* * *

Калі снег пачынае падаць калі
лепіцца ў горле ком не таму што
ты хочаш плакаць а таму што
зіма вакол

калі снег перастаў на вейках
таяць, людзі пад ліхтаром
танчаць рэгі на слізкіх рэйках і
дарма што зіма кругом

ты глядзіш з-за высокіх кратаў, а
ў вачох ўсё дрыжыць дрыжыць
не таму што ты ўжо заплакаў а
таму што жыццё імжыць

не ідзе, не вальсуе ў танцы, не
бурліць, не цячэ-бяжыць.
разумееш, што нават зараз
хочаш жыць.

### З **Новым годам**

Я ведаю, што так будзе
што я прачнуся 1-га студзеня
адзін дома
адзін у горадзе
адзін на двары
до рэ мі фа мі до рэ
спяваюць за вокнамі п'яныя

а я ныю ныю я завываю

а ты сцябешся, з цябе ж усё

роўна узяткі гладкі, усё-ткі я

сам вінаваты, што так

адбываецца з году ў год.

І гэта не лечыцца, і не лічыцца,

што быццам бы ёсць нагода —

дзве тысячы сем нагод!

Я і гарэлка "дзяржава" такое

вось дэжа вю,

такі бляха Новы год.

## Аўгіня Манцэвіч

* * *

Ужо трэці тыдзень жыву я без жонкі.

Шпалеры пажоўклі, адсталі ад сцен.

Сяджу, як пацук, не выходзячы вонкі,

Чакаю хоць нейкіх ў жыцці перамен.

Мне здрадзіла жонка, пайшла да суседа.

Я кінуў услед ёй: "Ну й нафіг ты мне?!!"

Яна ж (не пакінуўшы нават абеду)

Прамовіла: "Быць паміж намі вайне!"

Сяджу без вады, без святла ды без газу,

Бо грошай няма мне за іх заплаціць.

А шэф мой — дык гэта шчэ тая зараза! —

Ён звольніў мяне! Хай ён ў пекле гарыць!

Я ежу сабе не вару прынцыпова,

Ды мыцца не бачу болып сэнсу зусім.

Дык, мо, гаспадар, ты пачнеш ўсё нанова?

Твой бедны, галодны, няголены сім.

* * *

Хачу застрэліцца

хачу павесіцца

снег белы сцелецца у неба

лесвіца зіма халодная туга

няспынная дачка

ніводная не стане слыннаю сыноў

нямашака мужчыны — воіны у лесе

Машанька спалох падвоены

снег ціха лётае і дах пабелены

жыццё галёкае,

дзе я застрэлена.

# Максім Казакоў

## Каштаны

Я ведаў і адчуваў, што мне наканавана пакінуць свой дом і доўга жыць, дзе давядзецца. І я быў гатовы прайсці гэтае выпрабаванне, я быў гатовы стаць валацугам.

Яшчэ застаючыся ў сваім ранейшым, па-сутнасці, бестурботным жыцці, я як мог падрыхтаваўся да заўтрашняга дня. Я нават змог адшукаць у сваім доме трохі грошай, дастаткова, каб пражыць заўтрашні дзень, дастаткова, каб заўтра не быць галодным...

Я дрэнна ўяўляў, дзе зараз змагу начаваць, але я быў не адзін — са мной побач апынуўся чалавек, які па невядомых мне прычынах быў асуджаны на такое ж існаванне, як і я. Адчуванне таго, што я не адзін, вельмі натхніла мяне, удваіх мы ўжо сапраўды зможам знайсці месца для начлегу.

Мы селі ў аўтобус, і я разумеў, што, можа быць, апошні раз я еду на аўтобусе, на якім я так часта ездзіў у мінулым жыцці. Мой спадарожнік дастаў з кішэні грошы і кінуў іх у скрынку каля кіроўцы. Я падумаў, што і мне неабходна заплаціць за праезд. Я дастаў свае грошы, якія былі адной купюрай, і апусціў гэтую купюру ў тую самую скрынку. Грошай было не вельмі шмат, але ў некалькі разоў больш, чым каштуе праезд у такім аўтобусе. Я чакаў сваю рэшту, але кіроўца нават і не збіраўся яе адлічыць. З прыстойнасці і сарамлівасці я чакаў рэшту некалькі прыпынкаў, а затым паглядзеў на скрынку, у якой пакінуў усе свае грошы. Гэта была скрынка для хрысціянскіх ахвяраванняў...

Мой спадарожнік таксама кінуў у скрынку грошай больш, чым каштуе праезд, але па яго знешнім выглядзе было бачна, што ніякай рэшты ён не чакае. Я ахвяраваў грошы памылкова, недарэчна ашукаўшыся, гледзячы на таго, хто ахвяруе іх шчыра.

Гэтыя грошы былі гарантам майго заўтрашняга дня, што ж я буду заўтра есці?.. Але, хоць я і ахвяраваў грошы памылкова і хацеў бы вярнуць гарант свайго заўтрашняга дня, я не мог выняць грошы назад, ні перад гэтымі людзьмі, ні перад сабой.

Мы выйшлі з аўтобуса на наступным прыпынку і пайшлі шукаць сабе прыстанак на некалькі наступных дзён. Здавалася, мой спадарожнік ведае, дзе мы зможам яго знайсці.

Па дарозе мы натыкнуліся на незвычайнае дрэва, угледзеўшыся ў яго галіны, я заўважыў, што паміж лісцем растуць каштаны. У дзяцінстве мне распавядалі, што акрамя конскага каштана ёсць яшчэ і ядомы, але я ніколі не бачыў яго і, тым больш, ніколі не еў яго пладоў. Сарваўшы некалькі каштанаў, я паспрабаваў іх на смак. Нягледзячы на тое што я ніколі раней не спрабаваў ядомага каштана, я быў зусім упэўнены, што гэта менавіта ён, і вырашыў, што было б нядрэнна нарваць гэтых пладоў як мага больш і ўзяць ежу з сабой.

Я напаўняў імі кішэні і торбу, але хтосьці са сведкаў маёй мітусні злосна спытаў мяне, навошта я спрабую сарваць усе каштаны...

Дурні. Я вандроўнік, я валацуга без грошай у кішэні. Я нарву шмат каштанаў і буду ўпэўнены ў тым, што заўтра не застануся галодным.

І раптам я выкінуў усе сабраныя каштаны, мне было досыць тых, што я з'еў некалькі хвілін назад. І раптам усё шкадаванне з нагоды страчаных грошай, якія даюць упэўненасць у заўтрашнім дні, знікла, бо навошта мне ўпэўненасць у заўтрашнім дні,

бо навошта мне гарант заўтрашняга дня, калі мне наканаваны шлях значна даўжэйшы, чым заўтрашні дзень?..

### Срэбныя манеты

Ты маеш патрэбу ўва мне, і мы ідзем у шчаслівае месца. Я павінен утрымліваць, я павінен зарабляць, я павінен быць здабытчыкам, і таму праз пракол у зямлі праліваюцца хвалі срэбных манет, і таму я нахіляюся і грабу іх рукамі, і таму я жадаю сабраць усё да апошняй манеты.

На манетах адчаканены імперскія арлы. Краем вока я бачу людзей, што праходзяць міма. Іх старамоднае адзенне, што цалкам адпавядае імперскім манетам. І таму я не разумею, чаму яны не спрабуюць збіраць грошы, яны б не былі для іх лішнімі. Я б ім, напэўна, гэта нават дазволіў, таму што з зямлі лезуць усё новыя і новыя порцыі, з якімі я, відавочна, не здольны справіцца.

Я сяджу на кукішках, троху нахілены наперад, і, абапёршыся на рукі, збіраю манеты. У такім стане я магу бачыць мінакоў толькі па пояс і толькі бакавым зрокам. Побач са мной праходзіць яшчэ некалькі чалавек, апранутых у старамодную і злёгку мудрагелістую адзежу, і яны мяне зусім не заўважаюць. Пасля гэтага я пачынаю заўважаць, што зараз мінакі апрануты ў вельмі простыя працоўныя касцюмы. Манеты таксама сталі іншымі, на іх з'явіліся пралетарскія знакі, але я не кідаю збіраць грошы, што выцякаюць з-пад зямлі, як крынічная вада.

Людзі ўсё праходзілі і праходзілі міма, а я ўсё збіраў і збіраў грошы, і мне ніхто не замінаў і ніхто не прасіў падзяліцца, нават спроб такіх не рабіў.

Я не заўважыў, як мае рукі сталі зморшчанымі, але не гэта выклікала ў мяне смяротны смутак...

...Нечакана я зразумеў, што цябе ўжо даўно няма побач, што мы ўжо даўно не ідзем у шчаслівае месца, і, не адважваючыся падняць свой погляд, каб у гэтым пераканацца, я больш не збіраў рассыпаныя срэбныя манеты, але прымушаў сябе ўсё працягваць і працягваць пільна глядзець на іх...

### Крызіс хрысціянства

Хрысціянства з'яўляецца веравызнаннем у такой колькасці людзей, што калі кожны другі хрысціянін падчас таемства Еўхарыстыі спазнае ўсяго адну маленечкую порцыю гостыі ці прасфоры, то астатнія, у тым ліку і тыя, хто не падазрае аб існаванні хрысціянства, будуць асуджаны на голад. Гэта і ёсць крытычная кропка рэлігіі, гэта і ёсць шэпт крызісу гуманістычных з'яў, закліканых аб'ядноўваць людзей і заснаваных на гэтым...

## Сяргей Сакума

* * *

Марыя

З разгорнутымі рукамі

Адцала сына —

Раскрыжавалі...

А ці была б ты шчаслівa,

Каб сын твой быў простым дзіцем...?

Марыя,

У золаце лістападобным,

У белым аддзенні,

Перад вачыма... Ззяе...

А ці ж была б ты шчаслівa,

Не на алтары быць, а простай маці...?

* * *

Прыехаў у Вену,

Каб парэзаць вены,

Быццам лепшага кутка

Я не знайшоў,

Кроў цячэ з рукі,

Дунай цячэ павольна,

Поруч нейкія музыкі-мужыкі

Граюць вальсы венскія адвольна,

Так прыгожа, што не можна жыць.

Закруціцца ў скоках і забыцца

На былых каханак і сяброў,

У Дунаі сінім утапіцца

Пад разлівы музыкі без слоў.

* * *

Прывязі мне з Нясвіжа

Вежы, замкі, палацы,

Каляровыя мапы,

Брук няроўны на пляцах,

Скамарох, ліцадзеяў

У святочным убранні,

Шум натоўпу і гандлю

У хвіліну яднання,

Бом званоў па-над Фарай

І цыганскія словы,

Роў мядзведзяў ручных

Пад замежныя мовы,

Старажытных часоў

Паданні і згадкі,

Шолах паркаў сівых

Старадаўняй пасадкі,

Цішыню ад тых склепаў,

Дзе спяць небаракі,

Змагары і дзяржаўцы,

Прапойцы, гулякі,

Прыгажуні з партрэтаў

Залачоных у раме,

Што глядзяць на вас з сумам,

Лёсам наканаваным,

Пыл старых кніг,

Рукою пісаных,

Пах скарынінскіх слоў,

У Вільні надрукаваных,

А калі ноч запаліць свае ліхтары,

І народ сабярэцца ля вясёлай карчмы,

А магнаты паснуць без клапот на балі,

Гэта ўсё у скарбонку якую збяры,

І з Нясвіжа да места майго прывязі,

Калі будзе цяжка, у часы скаланечы,

Буду я разглядаць нясвіжскія рэчы,

Успамінаць, што раней помніў,

Ці то як раней жыў,

Уяўляць неадвольна,

Быццам я з вамі быў.

## Дзверы

Сёння на вочы мне патрапіла такая аб'ява:




І, памятаючы, што адклад не ідзе ў лад, я патэлефанаваў па напісаным нумары. Як ні дзіўна, трубку ўзялі адразу ж, і радасны голас сказаў мне: "Добры дзень!"

Я тут жа апынуўся пад уздзеяннем выходнай ад яго станоўчай энергіі: левая палова мозгу, а з ёй і ўсякая логіка, спрэс адключыліся, а правая палова, якая адказвае за вобразы, пачала маляваць карціны маіх будучых дзвярэй. Яны ўяўляліся мне такімі: пафарбаванымі ў жоўты колер, з прыгожай ручкай, якая дакладна адпавядала абрысам далоні ( не была ні халоднай, ні гарачай; ні маленькай, ні вялікай, а якраз неабходнага памеру, і размяшчалася якраз там, дзе тое мелася быць, і такім чынам, што не трэба было нахіляцца, каб яе націскаць (вобразы, якія малявала правая палова мозгу, зусім не ўлічвалі таго, што людзі бываюць рознага росту, а рукі — рознай даўжыні)). Мае дзверы лёгка адчыняліся і не спяшаліся зачыніцца перад носам ці за тваёй спіной, як бывае ў метро.

Гэтыя дзверы не былі створаны для таго, каб біць, палохаць, не прыхінацца... Гэтыя дзверы былі створаны для таго, каб іх адчынялі... людзі ў аднолькавых сініх камбінізонах, якіх даслала фірма, з аднолькава цяжкімі пласмасавымі валізкамі прайшліся па ангельскім газоне, такім абсалютна роўным, што няма было да чаго прычапіцца: здаецца, нейкі скурпулёзны газонакасільнчык штодня з лінейкай у руках сочыць за тым, каб ніводная травінка не вырасла вышэй за іншыя. Па праўдзе, у мяне нават і дома не было, былі толькі гэтыя ўяўныя дзверы, якія прыйшлі

ўвасабляць майстры. Штосьці іх было зашмат для адных дзвярэй, але я не надаў гэтаму вялікага значэння.

Яны пачалі рассцілаць паўсюль посцілкі ў клетку, даставаць з валізкаў розныя харчовыя прыпасы і акуратна раскладваць іх. На посцілках з'явіліся сэндвічы, халодныя закускі, напоі, садавіна ... Пачаўся пікнік ў ангельскім стылі. Усе агулам паселі на зялёную траву і сталі частавацца. Затым дзяўчаты пачалі гуляць у валан. А хлопцы ў сініх камбінезонах — у крыкет. Не зусім разумеючы сэнс гэтай гульні, але памятаючы, што ў падобную гульню гуляла Аліса у краіне цудаў, я назіраў, як мяч пракатваецца ў драўляныя варотцы. Паблізу сядзела шаноўная дама ў чорнай элегантнай сукенцы і раскладала пас'янс. Адкульсьці з'явіліся качкі, якія сваім краканнем прыцягнулі ўсеагульную увагу, і ўсе пачалі з імі фатаграфавацца. Да чаго ж гэта недарэчна выглядала: вытанчаныя паненкі ў сукенках па апошняй модзе, якая змяняецда кожны тыдзень. з профільнымі малюнкамі на шыкоўных медальёнах , у сеткавых пальчатках — і качкі, без аксэсуараў, але з такім пачуццём уласнага гонару ва ўсіх сваіх рухах.

Бліжэй да пяці вечара, калі падалі чай, усе пачалі пазіраць на гадзіннікі, але ў большасці на гадзінніках адсутнічалі лічбы, а таму было немагчыма даведацца дакладны час. Толькі я ведаў, што ўжо хутка трэба збірацца. Неўзабаве і сонца паказала, што пікнік падыйшоў да канца. Людзі ў сініх камбінезонах пачалі збіраць рэчы: скручваць посцілкі, збіраць пакінутую ежу ў кошыкі. Праз некаторы час пад'ехаў форд, каб забраць ўсіх у горад. І тут галоўны майстар, патупіўшы вочы, спытаўся ў мяне: а як жа дзверы? Мы не можам іх тут паставіць, бо тут няма нават сцен...

— Нічога, усё добра, — супакоіў яго я. — Іншым разам. Лета яшчэ не скончылася.

Машына павольна адштурхнулася ад паверхні і пачала змяншацца ў памерах, аж пакуль яе не стала бачна. Я лёг на гладка падстрыжаны газон і пачаў глядзець угару. Да пачатку крызісу 1929 года заставалася яшчэ два месяцы.

# Надзея Данішэўская

## Здавалася

Яму здавалася, што ён сам будуе сваё жыццё, нават не — збірае, як збіраюць канструктар ці пазлы.

Яму здавалася, што часткі жыцця — пазлы — бываюць двух колераў: чорныя ці белыя. І ў гэтым не было нічога наватарскага або крамольнага, таму што такая думка была ўласціва амаль усім жыхарам планеты, хворым на грамадскі дальтанізм.

Яму здавалася, што такі набор пазлаў даваўся чалавеку ад нараджэння некім ці нечым, магчыма, прыродай...

Яму здавалася...

Яму здавалася, што ў моманты найвялікшай стомы ён адчуваў дотык магутнай рукі, якая перасоўвала яго, нібы пешку, па бясконцай шахматнай дошцы.

Яму здавалася момантамі, што ўсё астатняе яму толькі здавалася, і тады ён замыкаўся ў сваёй кватэры, браў бутэльку гарэлкі і выпіваў яе цалкам *пад* віск і рогат рэкламы. Яго п'яны позірк надоўга застываў на вялізным бігбордзе, дзе на белым тле чорнымі літарамі было выведзена адно толькі слова: "БЫЦЬ"...

Ранкам яму здавалася, што ён сам будуе сваё жыццё, нават не збірае...

# Цім Пірс

## Сіні сум

Ён ведаў, што памёр у сераду 27-га ліпеня 1988 года ў той самы момант, калі прачнуўся ў пакоі, які пасьпеў узьненавідзець. Ён не пакідаў яго ўжо два месяцы запар і выдатна ведаў не толькі кожную рэч у ім: тэрмометр у шклянцы побач з лямпай, цяжкую камоду з шуфлядамі, цёмную і страшную шафу, — але таксама стан святла і ценю ў залежнасці ад часу дня; тое, як пашыраўся і звужаўся пакой, калі столевыя бэлькі ссыхаліся ўначы і разбухалі ўдзень; як цягам дня зьмяняліся гукі, і раніцою яго голас быў прыглушаны і ледзве дасягаў дзвярэй, а з надыходам цемры пакой ператвараўся ў гулкую залю, у якой імя яго дачкі — Джоан — адбівалася ад сценаў і рэхам вярталася да яго з розных бакоў.

Ён ведаў усе гэтыя рэчы, але ніводная не цікавіла яго, бо ён чэзнуў у гэтых накрухмаленых прасцінах, нязручных і нязграбных падушках, якія яго дачка з нейкім адчайным энтузіязмам рэгулярна ўзбівала і папраўляла, нібы тое самае жадала зрабіць з бацькам. Ён паступова губляў свой здаровы вясковы апетыт, пакуль глытаць нават булён ці сыраквашу, якія яна гатавала, не сталася пакутай. Па нейкай няўмольнай логіцы ён губляў вагу і з дужага селяніна ператвараўся ў схуднелага бедака. Упершыню за пяцьдзесят год яго рэбры тырчэлі, як у шкілета.

Боль блукаў па яго целе, нібы браканьер у пошуках слабога аленя па начным лесе. Спачатку боль стрэльнуў у пятцы, паўтарыўся ў шыі, а пасля паўгадовага перапынку ўзнік аднекуль з глыбіні і ўдарыў у сьпіну, і потым ужо ўвесь час вандраваў уверх і ўніз па хрыбетніку, часам адгукаючыся з асаблівай лютасцю. Ён ведаў, як і ўсе астатнія, што, хутчэй за ўсё, гэта рак лёгкіх, бо, пачынаючы з пятнаццаці год, ён паліў па два пачкі ў дзень. Дык якога чорта рак не з'еў яго лёгкія і не скончыў усё раз і назаўсёды?!

Гэты боль разбураў яго. Джозэф заўжды думаў, што ён абыякавы да болю, і яго ўнук Майк вырас у захапленні дзедавай пагардай і да выпадковых напасцяў, і да пастаяннай невыгоды сялянскага жыцця. Параніўшы руку або падрапаўшы галаў, ён толькі перавязваў рану насоўкай, калі надта замінала кроў.

І калі летась у лютым яны чысцілі сцёкавыя трубы, Майк, як дзіцё, заходзіўся ад холаду, а яго дзед, усунуўшы рукі ў заледзянелы бруд, працаваў, нібы абыякавы да ўсяго.

Але гэты боль быў іншы: ён учапіўся ў яго зубам, як першабытны зьвер, і нельга было ні вызваліцца ад яго, ні скончыць гэтае катаваньне. Яго нудзіла. Ён уяўляў, як награвае кухонны нож і выразае ім балючыя кавалкі сваёй плоці, быццам гэта магло прынесці збавенне. Але ён не мог нават дабрацца да сходаў. Доктар Бакл увесь час выпісваў яму разнастайныя лекі ды падвышаў дозу, пакуль боль непрытупляўся, а разам з ім — і ўсе пачуцці. Яму падавалася, нібы ён аддаляўся ў цёмны кут, дзе не было ні адчуванняў, ні пачуццяў, а толькі невыразная агіда да цьмяных праяваў таго свету, дзе ён некалі жыў, моцны і ўладарны.

Джозэф Говард ведаў, што памёр а трэцяй гадзіне дня, абудзіўшыся ад няскончанага сну і агледзеўшыся, пабачыў пакой так выразна, што гэта прымусіла памяць сягнуць праз гады. Ён так ясна не бачыў свет з сарака гадоў, бо не хацеў насіць акуляры пасьля таго, як пагоршыўся зрок. Ён мог бачыць стрэлкі будзільніка, нават не падносячы яго пад самы нос, і разабраць кожную сцяблінку і пялёстак на сініх шпалерах. Абрысы рэчаў былі незвычайна дакладныя, і кожная мела сваё асабістае акрэсленае месца, замест таго, каб зліцца разам у невыразную мешаніну.

Ён напружыў слых і пачуў, як нехта крычаў на вуліцы. І хаця голас гучаў занадта далёка, каб разабраць асобныя словы, па інтанацыі Джозэф беспамылкова здагадаўся, што гэта быў яго ўнук Майк. Аднак больш дзіўным было тое, што, калі хтосьці іншы азваўся яшчэ далей, ён пазнаў у ім Тома, унука старога Фрымантла.

І ў той самы момант ён заўважыў, што боль прайшоў. Ва ўсім целе была толькі невялічкая слабасць, больш падобная да сымптомаў звычайнага грыпу, нібыта ў сне яго нехта валтузіў, але пачуццё гэтае так рознілася ад агоніі апошніх месяцаў, што адчуваў ён сябе проста выдатна. Ён падняўся з ложка і стаў на ногі, але кроў рэзка адліла ад галавы, і адразу стала млосна, таму ён зноў прысеў, каб не згубіць раўнавагі. Але, тым не менш, гэта было так прыемна — зноў адчуць млосць, слабасць і разгубленасць. Гэта нагадала яму, як аднойчы, яшчэ зялёным падлеткам, ён ледзьве не страціў прытомнасць на падворку, як зямля нечакана пачала выслізгваць з-пад ног і вочы заслаў туман.

Джозэф ужо скончыў апранацца і завязваў шнуркі, па-дзіцячы засяроджана і задаволена, калі ў пакой увайшла яго дачка з кубкам слабой гарбаты. "Божачкі! — закрычала яна. — Тата, што з табой?!" Яна мігам падбегла да ложка, але ён нават не глянуў на яе, пакуль не скончыў апранацца. Затым прысеў, паглядзеў ёй у вочы і сказаў: "Джоан, мне ўжо лучша, я ўстаю". Але неўзабаве ён перастаў усміхацца і ўважліва ўгледзеўся ў ейны твар, на гэта яна ніяк не адрэагавала. Ён заўважыў гусіныя лапкі і цёмныя мяшкі пад вачыма, маленькія зморшчынкі каля вуснаў, і сказаў: "Ты малайчына, Джоан".

Ён ведаў, што памёр, але яму гэта не абыходзіла. Ён знайшоў свой кіёк за дзвярыма і выправіўся на шпацыр у вёску. Ён адчуваў, як кроў жыва струменіла па венах, і левае сьцягно яму больш не балела. Па дарозе ў краму ён сустрэў двух ці трох чалавек, вясёла павітаўся, а яны адказалі здзіўлена і разгублена.

У краме зазваніў званочак, і Элсі выйшла з кухні. Яе вялізныя савіныя вочы ў акулярах з тоўстым шклом спачатку пашырыліся, а потым зноў звузіліся. "А Джоан знаіць, што ты сыйшоў, Джозэф? — запыталася яна падазрона. — Яна во толькі ж тут была".

"Не перажывай за мяне, Элсі, — адказаў ён. — Я ў поўным парадку. Мне б толькі цыгарак. Сто гадоў не курыў".

Элсі зьбянтэжана адвяла вочы: "У мяне няма тваіх, Джозэф. Такіх ніхто не курыў". Яна пацягнулася да паліцаў: "Можа, вазьмі гэныя. Кажуць, крэпкія".

"Ды нічога, вазьму гэныя," — усьміхнуўся ён. Яна хуценька працягнулаяму пачак, і ён паклаў яго ў кішэнь. "Трасца! Я ж грошы забыўся! — сказаў ён. — Ты знаеш, я ў доўг не лезу. Малец пасля грошы прынясе".

"Канечне, дзеду, — сказала яна, нават ня гледзячы на яго. — Дык ідзі ўжо".

Выходзячы, ён павярнуўся і дадаў: "Я, можа, і сам прынясу".

Доктар Бакл прыйшоў на наступны дзень, памераў тэмпэратуру, праверыў пульс, паслухаў лёгкія стэтаскопам. Потым аб'явіў з навуковай абыякавасцю: "Усе сымптомы паслабленьня хваробы. Але ты яшчэ слабы. Неператамляйся".

Ён хацеў быў вярнуцца да гаспадаркі, але Джоан загадала Майку сачыць, каб стары нават саломінкі не падняў, таму ўнук пакінуў дзеда ў двары. Джозэф гуляў па садзе ды соваўся паміж адрынай, пуняй і хлявом. Дзень быў спякотны, сонца высока стаяла ў блакітным небе, ён выціраў пот з ілба і шыі. Вераб'і чародкамі гойсалі па

двары, дрозд спяваў на яблыні, і калі ен заўважаў адну сароку ў полі, ведаў, што сустрэне і яшчэ адну. І, канечне, так і было. Вось яна на плоце.

Багоўка села яму на тыльны бок далоні. Спачатку гэтая малеча здзівіла яго толькі таму, што цяпер ён добра бачыў, але потым ён заўважыў, што ў яе былі чырвоныя кропачкі на чорнай спіне, а не наадварот. Ён сумняваўся, што калі-небудзь дагэтуль бачыў такую багоўку, хоць, мажліва, і бачыў, але гэта яго раней ня ўражвала. Для яе павінна ж быць нейкае імя, думаў ён: магчыма, адваротная багоўка, ці багоўка навыварат. Ён падняў руку і падзьмуў, жамярынка раскрыла крыльцы і паляцела.

Пакуль ён гаротна згасаў, Джоан шматкроць на дзень без аніякага дакору падымалася па сходнях, каб узбіць падушкі, паправіць пасцель, дапамагчы з суднам і вынесці яго ў прыбіральню, уцірала крэм у яго сухую скуру, і, у рэшце, карміла з лыжкі. Яго папраўка мусіла стаць для яе вялікай палёгкай, і Джозэф быў шчыра ўдзячны ёй за тое, што дачка дазволіла яму цяпер самому займацца сабой. Калі час набліжаўся да абеду, ён адчуў нейкае дзіўнае і прыемнае пачуцьцё ўнутры і са здзіўленьнем зразумеў, што гэта быў голад. Ён пайшоў на кухню.

"Дачушка, не паверыш, я нешта есці схацеў!" Яна нават не глянула на яго, адно замітусілася каля лядоўні і прамовіла: "Сядай, зраблю перахапіць".

Джозэф сеў за стол і паклаў папіросы ды запалкі на яго шурпатую паверхню. Ён узгадаў, як яго бацька зрабіў гэты стол з вялізнай бярозы, якую аднойчы ў красавіку зваліла бура. Ён успомніў салодкі пах пілавіньня ў дальняй адрыне, дзе бацька майстраваў стол, і нават тое, як ён трымаў цвікі ў вільготных вуснах.

Джоан паставіла перад ім талерку і, выходзячы, прамармытала, што пайшла ў краму. Ён глядзеў на яе праз вакно, пакуль тая не зьнікала з далягляду, а потым заплюшчыў вочы, каб лепш адчуць мяккасць хлеба і шурпатасьць вяндліны, каб атрымаць асалоду ад рэзкага задзёрыстага смаку гарчыцы ўперамежку з гранулямі цукру дэмэрара.

Тым жа вечарам пасля вячэры ён прапанаваў Майку згуляцьу шашкі. Апошні раз яны гулялі, калі Майк быў яшчэ малы. Джозэф вучыў унука гульні пасьля таго, як бацька іх кінуў. Яны згулялі пяць ці шэсць гульняў. Увесь час Майк сядзеў, ніякавата схіліўшыся над дошкай, не гледзячы на дзеда, які выйграваў партыю за партыяй.

Той ноччу Джозэф не варочаўся і не ўсхопліваўся ад жудасных наркатычных мрояў апошніх месяцаў. Ён спакойна праспаў восем гадзін і прачнуўся вельмі бадзёрым. Раніцой ён ляжаў і слухаў, як квакталі на двары куры і мітусіліся ластаўкі. Ён пазяхнуў і павольна пацягнуўся. Яго старыя цягліцы зноўку сталі эластычнымі, і гэтае новае пачуццё ўзрадавала яго.

Апрануўшыся, ён пабачыў, што яго старэйшы ўнук Джон, які заўжды вяртаўся позна, а выпраўляўся рана, ужо з'ехаў на працу ў Эгзэтэр. Джозэф спусціўся ўніз. На кухні нікога не было. Ен чуў, як завёўся трактар на двары, і пасьпяшаў туды. Ён гукнуў Майка, але той не азірнуўся, а трактар толькі керхануў ды загрукатаў па дарозе. Ён вярнуўся ў дом і гукаў дачку, але ніхто не азваўся. Таму ён зрабіў сабе кубак моцнай гарбаты і задумаўся, ці кожны здолее прыгатаваць грэнкі. Аказалася, што не кожны, бо грэнкі ён спаліў, але ўсё роўна з'еў, атрымаўшы асалоду ад хлеба з шакаладам, маслам і з таўстым слоем хатняга мармеладу. Ён прыхапіў свой брыль і выйшаў на двор.

Ён ведаў, што памёр, бо пачуваўся лёгка і вольна. Ён падумаў, што няблага было б сёння ўвечары пабарукацца з Майкам на руках, і ў голас засмяўся ад гэтай думкі. Ён глянуў на сонца, але з вачэй у яго пацяклі слёзы.

Ён пайшоў праз палі. Пшаніца была высокаю і крохкаю. Ён раскусіў некалькі зярнятаў, адчуў сухі смак мукі на языку і задумаўся, хто першым вынайшаў, як рабіць муку, а потым хлеб. Ён зайшоў на пашу, дзе пасвіўся яго статак, прайшоўся сярод кароў, пагладжваючы іх па баках. Ён закасаў свае рукавы і працягнуў да іх рукі. Самыя смелыя з кароў лізалі яго салёную скуру шурпатымі вільготнымі языкамі, але, як і астатнія, панура глядзелі на яго са страхам і дакорам. Ён падумаў, ці даравалі яны яму за жыццё прыгнятальніка і мясніка, і адчуў, як моцна любіў ён і гэтую ферму, і гэтых жывёлінаў, і гэты багаты і пакручасты лог.

Джозэф пайшоў у вёску. Калі ён пачаў падымацца па вуліцы Шырокай, то ўспомніў, што недзе пакінуў свой кіёк, але раптам адчуў, што ў ім ужо не было патрэбы. Ён ішоў на сагнутых нагах з крыху падкурчанымі пальцамі. Сухажыллі, цягліцы і вены больш не турбавалі яго. Ён толькі ішоў наперад і энергічнымі рухамі здаровага чалавека выціраў пот з ілба. Упершыню за доўгі час — ён нават ня памятаў, калі гэта было апошнім разам — ён узгадаў сваю жонку, з якой хадзіў пешшу да Стромкага Узгорка, а потым заляцаўся да яе падчас доўгіх шпацыраў па Хэлданскім парку, дзе ў той час, калі недзе далёка лютавала Другая Сусветная, яны нечакана заняліся каханнем, у ценю хвояў на калючым ложку з шышак і іголак, і сухія галінкі трашчалі падчас іх рухаў. Але, папраўдзе, ён зразумеў, што менш думаў пра яе, чым пра сябе: як шмат хадзіў ён у сваім жыцці! Ён цяпер мог ісці і ісці, не спыняючыся. Ён адчуваў сябе такім моцным, ён адчуваў, што можа пешшу прайсці ўсю даліну ракі Тэйн і вярнуцца назад.

Падчас шпацыру Джозэф азіраўся наўкола, заглядваў за платы і весніцы, але на вуліцы не было ні душы. Калі ён падышоў да тэлефоннай будкі, яму падалося, што ўдалечыні па дарожцы бегла дзіця, але ён не быў у гэтым пэўны. Ён сеў на лаўку каля хаты Браўнаў. Самаробная футбольная брама выглядала адзінокай і занядбанай. Недарэчная тэлевізійная карцінка выплыла аднекуль з глыбіні памяці, гэта быў вобраз цудоўнага чарнаскурага абаронцы французкай зборнай Марыўса Трэзора, які выдатна гуляў у захапляючым і напружаным паўфінале Чэмпіяната свету 1982 года.

Джозэф адчуў, як некалькі кропелек дажджу ўпалі на руку. Ён падняў вочы, але неба было чыстым і бездакорна сінім. Ён падумаў, што гэта, мабыць, паколванне ў руках. Ён падняў іх угару, крыху патрос, правёў імі па твары. Свет быў маўклівым і пустым. Ён ведаў, што памёр тры дні таму а трэцяй гадзіне, ён падаўся наперад, абхапіўшы галаву рукамі, і заплакаў.

Пачуўшы царкоўныя званы, ён выцер вочы вільготнай ад поту насоўкай, ад якой запекла ў вачох, прайшоў міма прытулку для бедных, паўз вясковы клуб, куды ён некалі хадзіў у школу, і накіраваўся праз браму на могілкі. На адлегласці дваццаці метраў далакопы апускалі ў зямлю труну, і пастыр уголас чытаў Біблію, але Джозэф не чуў яго. Потым пастыр, усё яшчэ чытаючы, узяў жменю зямлі і кінуў яе ў дол, і Джозэф сапраўды пачуў, хоць і слаба, як камякі зямлі скатваліся па вечку дамавіны.

Ён там усіх ведаў: свайго сябра Грэні Сімса, царкоўнага старасту, Дугласа Ўэсткатa, старога Фрымантла з сям'ёй, Марціна, былога цесляра, Элсі і Сцюарта з крамы.

Таксама тут былі і яго родныя: перад усялякімі кузінамі ды кузэнамі, пляменніцамі ды пляменнікамі стаяў Джон, трымаючы сваю маці Джоан за руку, а Майк выглядаў так, нібы яму неадкладна трэба было сесці, бо ён усім целам абапіраўся на сваю дзяўчыну, імя якой Джозэф ніяк не мог успомніць.

Ён глянуў на іх праз магілу і ўпершыню пасля смерці адчуў прыліў гневу. Ён літаральна перапаўняў яго, чысты, фізічны гнеў. Проста выбух жоўці, а сэрца яго пампавала гарачую кроў у вены. Вулканічны гнеў. Гнеў быў настолькі моцны, што здавалася, Джозэф выбухне.

Ён заплюшчыў вочы, сціснуў кулакі і заскрыгатаў зубамі. А потым выкрыкнуў: "Чаму ты не паказаў мне гэты свет раней, ты, вырадак?!" Ён падняў вочы да бязмежнага сіняга сумнага неба, адчуў лёгкасць і паляцеў.

**пераклала Юля Цімафеева**

# П.Біхсэль

## Сан Сальвадор

Ён купіў сабе новую асадку.

Найперш некалькі разоў вывеў на паперы свой подпіс, затым — свае ініцыялы, адрас, нейкія вілюжкі, затым — адрас сваіх бацькоў, а пасля ўзяў новы аркуш, старанна яго сагнуў і напісаў: "Мне тут занадта холадна". І далей: "Я еду ў Паўднёвую Амерыку". На гэтым спыніўся, закруціў калпачок. Глядзеў на аркуш і назіраў, як сохнуць і цямнеюць чарнілы (у інструкцыі гарантавалася, што яны будуць чорнымі), затым ён зноў узяў у руку асадку і падпісаў унізе сваё імя — Пауль.

І ўсё сядзеў.

Пазней прагледзеў кінаафішу і кінуў на столік газету, падумаў пра нешта, штурхнуў убок попельніцу, разадраў паперку з вілюгамі, дастаў з асадкі стрыжань і зноў засунуў яго назад. Для паходу ў кіно было ўжо запозна.

Рэпетыцыя царкоўнага хора скончыцца а дзевятай, Хільдэгард вернецца а палове на дзесятую. Ён чакаў Хільдэгарт. На ўсю — музыка па радыё. Нарэшце ён яго выключыў.

На стале, на сярэдзіне стала, яшчэ ляжаў сагнуты ліст паперы, на якім сіне-чорнымі літарамі было выведзена ягонае імя — Пауль.

"Мне тут занадта холадна," — было там таксама.

Значыць, Хільдэгард вярнулася б, а палове на дзесятую. Цяпер ужо дзевяць. Яна прачытала б ягоны ліст, спалохалася б, не паверыла б, канечне, пра Паўднёвую Амерыку, але ўсё адно пералічыла б кашулі ў шафе, бо нешта ж напэўна адбылося.

Патэлефанавала б у "Ільвы".

Там у сераду зачынена.

Яна б усміхнулася і страціла надзею, але, магчыма, і суцешылася б. Раз за разам адкідвала б з твара валасы, вадзіла б безыменным пальцам левай рукі па скронях, а потым бы павольна расшпіліла паліто.

Ён усё сядзеў, разважаючы, што было б, калі б ён змог напісаць гэты ліст, прачытаў яшчэ раз, крыху нахіліўшыся ўправа, інструкцыю да асадкі, прачытаў таксама французкі тэкст, параўнаў англійскі з нямецкім, зноў паглядзеў на сваю запіску, падумаў пра пальмы, падумаў пра Хільдэгард.

І сядзеў.

А палове на дзесятую прыйшла Хільдэгард і спыталася: "Дзеці спяць?" І адкінула з твара валасы.

**пераклала Наталля Давыдоўская**

# Герман Гесэ

## Па слядах мроі

Жыў некалі на свеце чалавек, які займаўся не надта паважаным рамяством аўтара забаўляльнай літаратуры; належаў ён, аднак, да той нешматлікай кагорты літаратараў, што ставяцца да сваёй прафесіі па-магчымасці сур'ёзна, да тых летуценнікаў, што адчуваюць да яе такую ж пашану, якою ў ранейшыя часы, калі існавалі яшчэ паэты і паэзія, былі споўнены сапраўдныя паэты. Гэты літаратар пісаў розныя мілыя штучкі: раманы, апавяданні, таксама і вершы — і прыкладаў усе намаганні, каб зрабіць свае творы добрымі. *Аднак рэдка выпадала яму задаволіць* сваё самалюбства; ён рабіў памылку, калі, уважаючы сябе за чалавека адоранага, параўноўваў сябе не са сваімі калегамі-сучаснікамі, іншымі аўтарамі забаўляльнай літаратуры, а з паэтамі мінулых часоў, якія жылі некалькі пакаленняў назад, бо тады мусіў ён зноў і зноў з болем пераконвацца, што найлепшыя і найбольш удалыя з напісаных ім старонак стаяць ніжэй, чым самыя няўдалыя радкі і сказы гэтых сапраўдных паэтаў. Так быў ён заўсёды незадаволены і страціў усялякую радасць працы, а калі і пісаў яшчэ час ад часу нейкую драбязу, то рабіў гэта толькі дзеля таго, каб мець аддушыну, надаўшы незадаволенасці і ўнутранай смазе форму з'едлівай крытыкі свайго часу і сябе самога, і, натуральна, палёгкі яму ад гэтага не было. Часам ён зноў спрабаваў вярнуцца ў чароўныя сады чыстай паэзіі і апяваў прыгажосць у міленькіх творах, узводзячы праўдзівы помнік прыродзе, жанчыне і сяброўству, і вершы гэтыя насамрэч мелі пэўную музыку і падабенства да сапраўднай паэзіі сапраўдных паэтаў, яны нагадвалі пра іх такім жа чынам, як мімалётная закаханасць гандляра або свецкага чалавека можа выпадкова нагадаць яму пра ягоную страчаную душу.

Аднойчы напрадвесні гэты пісьменнік, які з такою радасцю быў бы паэтам, — а некаторыя і сапраўды лічылі яго паэтам — сядзеў за сваім пісьмовым сталом. Як звычайна, падняўся ён позна, бліжэй да абеду, бо перад тым да самай ночы чытаў. І вось ён сядзеў і пільна ўзіраўся ў ліст паперы, на якім пісаў учора з такім натхненнем. Там былі разумныя думкі, выказаныя гнуткаю і прыгожаю моваю, тонкія назіранні, споўненыя мастацкасці апісанні, з гэтых радкоў і старонак ляцелі цудоўныя ракеты і феерверкі, гучалі чароўныя пачуцці... І тым не менш пісьменнік быў расчараваны, без ілюзій глядзеў ён на тое, што ўчора вечарам пачынаў пісаць з сапраўднымі радасцю і натхненнем, на тое, што ўчора на працягу некалькіх вечаровых гадзін выглядала паэзіяй, а за ноч зноў ператварылася ў літаратуру, у прыкра спісаную паперу, якой, па вялікім рахунку, было шкада.

Аднак у гэтыя крыху жалобныя гадзіны ён адчуваў і думаў тое самае, што адчуваў і думаў ужо шмат разоў, а менавіта — дзіўную трапкамічнасць свайго становішча, недарэчнасць сваіх патаемных пасягненняў на занятк сапраўднай паэзіяй (тым больш што ў нашы часы не можа быць сапраўднай паэзіі), а таксама дзіцячасць і бязглуздую марнасць свайго імкнення з дапамогаю любові да старой паэзіі, з дапамогаю яе высокага прыкладу, з дапамогаю свайго тонкага адчування слова сапраўдных паэтаў стварыць тое, што будзе нагадваць сапраўдную паэзію або будзе падобным да яе, як дзве кроплі вады (пры гэтым ён выдатна разумеў, што пры дапамозе адукацыі і пераймання наогул нельга стварыць нічога вартага).

У глыбіні душы ён выдатна ведаў, што безнадзейная прэтэнцыёзнасць і дзіцячая ілюзорнасць усіх ягоных намаганняў ніякім чынам не з'яўляюцца ягонай асабістай, персанальнай праблемай, што кожны чалавек, нават знешне нармальны, нават знешне шчаслівы і паспяховы песціць у сабе тыя самыя вар'яцтва і самападман, што кожны чалавек заўсёды бесперапынна імкнецца да нечага немагчымага, што пачвара носіць у сабе ідэал Аданіса, дурань — ідэал мудраца, а бядняк — мары пра багацці Крэза. Так, у глыбіні душы ён нават ведаў, што такі высокашаноўны ідэал, як "сапраўдная паэзія", па-сутнасці — пусты гук, што Гётэ так сама безнадзейна

глядзеў на Гамера або Шэкспіра і лічыў іх талент непераўзыйдзеным, як сённяшні літаратар мог бы глядзець на Гётэ, і што само паняцце "паэт" — толькі прыгожая абстракцыя, што нават Гамер і Шэкспір былі ўсяго толькі літаратарамі, адоранымі спецыялістамі, якія здолелі надаць сваім творам пэўнае падабенства вечнасці і надіндывідуальнасці. У глыбіні душы ён гэта ўсё ведаў, бо кожны разумны і схільны да разважанняў чалавек можа спасцігнуць такія зразумелыя і балючыя ісціны. Ён ведаў альбо здагадваўся, што пэўная частка ягоных опусаў таксама, магчыма, будзе рабіць на чытачоў наступных пакаленняў уражанне "сапраўднай паэзіі", што будучыя літаратары, магчыма, будуць азірацца з тугою на яго і на ягоныя часы, як на залатую даўніну, калі яшчэ былі сапраўдныя паэты, сапраўдныя пачуцці, сапраўдныя людзі, сапраўдная прырода і сапраўдная духоўнасць. Ён ведаў, што заможныя мяшчане часоў Бідэрмана або мажныя бюргеры сярэдявечных местаў гэтак жа крытычна і гэтак жа сентыментальна супрацьпастаўлялі свой уласны рафінаваны і бязладны час цнатліваму, наіўнаму і светламу ўчора і глядзелі на сваіх прадзедаў і іх лад жыцця з той самай мешанінаю зайздрасці і спачування, з якою сучасны чалавек мае схільнасць глядзець на часы, калі яшчэ не было вынайдзена паравой машыны.

Усе гэтыя думкі былі звыклымі для літаратара, усе гэтыя ісціны былі яму зразумелымі. Ён ведаў — тая самая гульня, тое самае прагнае, высакароднае, безнадзейнае імкненне да нечага сапраўднага, вечнага, безумоўна каштоўнага, што вымушае яго спісваць столькі паперы, вярэдзіць і ўсіх астатніх: генерала, міністра, дэпутата, элегантную пані, гандляра. Кожны чалавек, так разумна або так па-дурному, — у залежнасці ад сваіх здольнасцей — імкнецца выйсці за межы самога сябе, за межы магчымага, у кожным гарыць патаемная мара, кожны натхнёны нейкім прыкладам, паланёны нейкім ідэалам. Няма лейтэнанта, які не насіў бы ў сабе думкі стаць Напалеонам, і няма Напалеона, які час ад часу не лічыў бы сябе малпаю, свой поспех — гульнёю выпадку, сваю мэту — ілюзіяй. Няма ніводнага чалавека, не ўцягнутага ў гэты танец. Як няма таксама і таго, хто хоць бы часам, праз якую-небудзь шчылінку не адчуў бы гэты падман. Вядома, былі дасканалыя, былі богачалавекі, быў Буда, быў Ісус, быў Сакрат. Але нават яны былі дасканалымі і прасякнутымі ўсяведаннем толькі адно адзінае імгненне — імгненне сваёй смерці. Іх смерць і была апошнім усяведаннем, апошняю, канчатковаю, шчасліваю адданасцю. І, магчыма, кожная смерць значыць менавіта гэта, магчыма, кожны памерлы робіцца дасканалым, адмаўляецца нарэшце ад падманнасці імкненняў, належыць зноў самому сабе, больш ужо нічога не прагне.

Гэтыя зусім не складаныя думкі моцна замінalі герою ў ягоным імкненні, у ягонай справе, не давалі працягваць гульню. У такія гадзіны праца паэта зусім не рухалася. Не было ніводнага слова, вартага запісу, ніводнай думкі, якую насамрэч трэба было б выказаць. Не, на гэта проста шкада паперы, лепш пакінуць яе чыстай.

З такімі пачуццямі літаратар паклаў пяро, засунуў паперу ў стол. Каб пад рукамі быў агонь, ён засунуў бы яе ў агонь. Сітуацыя не была новаю, ён часта адчуваў гэты адчай і ўжо ўмеў з ім змагацца.

Ён памыў рукі, апрануў капялюш і паліто і выйшаў. Змена месца была найлепшай дапамогай, ён ведаў, што нельга ў такім стане доўга заставацца дома, сярод усёй гэтай спісанай і няспісанай паперы. Лепш было выйсці, дыхаць паветрам і глядзець на зменлівыя малюнкі вуліцы. Вядома, яму сустрэнуцца прыгожыя жанчыны або ён напаткае сябра, арава школьнікаў ці якая-небудзь цікавая вітрына навядуць яго на іншыя думкі, можна да таго ж меркаваць, што аўто аднаго з гаспадароў гэтага свету, якога-небудзь выдаўца газет ці багатага банкіра, пераедзе яго на скрыжаванні: эфектная магчымасць змяніць становішча, стварыць новую сітуацыю.

Павольна бадзяўся ён на вясновым паветры, пазіраў на паніклыя кусты падснежнікаўпралесак, што раслі на панылых кавалачках чарназёму перад жылымі дамамі, удыхаў вільготнае, снежнае сакавіцкае паветра, якое спакусіла яго зайсці ў парк.

Там, на сонейку, паміж голых дрэў ён сеў на лаўку, заплюшчыў вочы і адцаўся гульні адчуванняў у гэты ранні сонечны час: як мякка лашчыць твар паветра, як непрыкметна, але ўжо моцна прыпякае сонца, як напружана і трывожна пахне глеба, як радасна, гарэзліва крочаць маленькія дзіцячыя боцікі па камяністай сцежцы, як дзівосна і празмерна салодка спявае дзесьці ў неапранутым яшчэ пералеску чорны дрозд. Так, гэта ўсё было цудоўным, і вясна,сонца, дзеці, дрозд былі тымі простымі першададзенымі рэчамі, якія ўжо тысячы тысяч гадоў радуюць чалавека; адзінае, што было незразумелым, дык гэта чаму ў нашыя дні ніхто не можа напісаць такі ж добры, прыгожы вясновы верш, як пяцьдзесят ці сто гадоў назад. І гэта яшчэ не ўсё. Лёгкай згадкі пра вясновую песню Уланда (натуральна, на музыку Шуберта, якая так чароўна і пранікнёна перадае хараство першых вясновых дзён) было дастаткова, каб выразна паказаць сучасным паэтам, што гэтая дасканалая рэч была створана для вечнасці і што няма ніякага сэнсу імкнуцца стварыць нешта хоць крыху падобнае да гэтых невычэрпных, дзівосна адухоўленых вобразаў. І ў тое самае імгненне, калі думка паэта пачынала зварочваць на старую бясплодную\бясплённую сцежку, ён зірнуў з-пад прыкрытых павек, праз вузкую шчыліну вачэй і ўбачыў — не толькіаднымі вачыма — іскрыстыя светлавыя сумёты, сонечныя выспы, гульню светлаценю, заплямлены дзе-нідзе беллю нябесны блакіт, урачысты карагод рухомага святла — усё тое, што можа ўбачыць кожны, зірнуўшы на сонца, і, аднак, гэта было нешта цалкам адметнае, нешта настолькі каштоўнае і непаўторнае, што ператварала пустыя назіранні ў значную падзею. Усё, што тут ззяла, пералівалася, знікала, хвалявалася і ўзмахвала крыламі, не было проста плынню святла, і дзеялася ўсё гэта не звонку, перад вачыма, а было самім жыццём, абуджаным унутраным імкненнем і адбывалася ў душы, было ягоным лёсам. Так глядзеў на ўсё гэта паэт, "глядач", так усхвалявана і зачаравана глядзіць кожны, каго паклікаў Эрас. Зніклі думкі пра Уланда, і Шуберта, і вясновую песню, больш не было ні Уланда, ні паэзіі, ні мінулага, усё было — вечнае імгненне, падзея, найглыбейшая рэальнасць.

Аднак ён, аддаўшыся рэдкаму перажыванню, пазіраў перад сабою прыжмуранымі вачыма і трымаў усе брамы, праз якія прыходзяць ўражанні, напаўзачыненымі, бо добра ведаў, што гэтая цудоўная рака выцякае з яго нутра. Але раптам ён заўважыў каля сябе нешта такое, што прыцягнула ягоную ўвагу. Як зразумеў ён не адразу, гэта была маленькая нага дзяўчынкі, яшчэ дзіцяці, абутая ў карычневы скураны чаравічак. Цвёрда і радасна крочыла яна па пясчанай сцежцы, стукаючы абцасікам. Гэты маленькі дзявочы чаравічак, гэтая карычневая скура, гэтая радасная дзіцячая хада маленькай ступні, гэты кавалачак ваўнянай панчохі на мілай ножцы нагадалі паэту пра нешта, раптоўна авалодалі ягоным сэрцам, пацягнулі яго да сябе, як напамін пра нейкія вельмі важныя падзеі, ніткі якіх ён ніяк не мог адшукаць. Дзіцячы чаравічак, дзіцячая ножка, дзіцячая панчоха — адкуль усё гэта? Дзе ключ? Дзе ў ягонай душы тая крыніца, што адшукае гэты малюнак сярод мільёнаў іншых, патлумачыць усё тое, што жыло, вабіла, што — ён адчуваў гэта — было вельмі важным?

Ён расплюшчыў вочы, агледзеў — на працягу аднаго ўдара сэрца — усю фігурку дзіцяці, мілага дзіцяці, аднак тут жа адчуў, што гэта ўжо не той малюнак, які ўразіў яго і быў важным, і міжволі зноў заплюшчыў вочы так, каб яшчэ раз паглядзець на знікаючую дзіцячую ножку. Потым ён зусім заплюшчыў вочы, разважаючы пра ножку і адчуваючы яе незразуметую яшчэ значнасць, пакутуючы ад няўдалых пошукаў, захапляючыся сілаю гэтага малюнка ў ягонай душы. Калі, дзе сустракалася яму гэтая маленькая ножка ў карычневым чаравічку, што зрабілася аж такой каштоўнай? Калі гэта магло быць? О, гэта, пэўна, было вельмі даўно, у дачассе, так далёка падавалася яно схаваным, так безнадзейна далёка, яно выбліснула з непамысных

глыбіняў свядомасці, было так глыбока ў калодзежы ягонай памяці. Магчыма, ён гэта перажыў, страціў, каб ніколі дасюль не згадваць, у самым ранім дзяцінстве, у тыя дзівосныя часы, успаміны пра якія знікаюць і размываюцца, так што цяжка іх дагукацца, аднак жа якія ярчэйшыя, цяплейшыя і глыбейшыя, чым больш познія ўспаміны. Ён доўга ламаў галаву, не расплюшчваючы вачэй, перабіраў у памяці тое і гэтае, выцягваў на святло нейкую нітку, нейкі шэраг, нейкі ланцуг падзей. Але нідзе не было дзіцяці, нідзе не знаходзілася карычневага дзіцячага чаравічка. Не, усё марна, пошукі бессэнсоўныя.

У гэтых пошуках ісціны паэт быў падобны на чалавека, які не можа разгледзець вельмі блізкі прадмет, бо ўяўляе яго далёкім і таму ўспрымае ўсе формы няправільна. Аднак у той самы момант, калі ён ужо адмовіўся ад сваіх намаганняў і гатовы быў забыцца на маленькі ўсмешлівы праменьчык гэтай падзеі, прадметы павярнуліся да яго іншым бокам і дзіцячы чаравічак заняў сваё сапраўднае месца. Глыбока ўздыхнуўшы, мужчына раптам адчуў, што ў загрувашчаных пакоях яго ўнутранага свету дзіцячы чаравічак не ляжыць на самым нізе, што ён не належыць самым першым добрым часам, а, наадварот, вельмі новы і свежы. Зусім нядаўна сустракаўся ён з гэтым дзіцем, зусім нядаўна, падавалася, бачыў ён, як знікае ў далечыні гэты чаравічак.

Сэрца ягонае моцна забілася. Так, ну зразумела ж, гэта было тут, тут стаяла дзіця, якому належаў чаравік, гэта ўсё адбывалася ў сне, які прысніўся пісьменніку мінулай ноччу. Божа, як можна было забыць пра гэта? Сярод ночы ён прачнуўся, шчаслівы і глыбока ўзрушаны таямнічаю сілаю сваёй мроі, ён абудзіўся праз адчуванне найважнейшай і найістотнейшай падзеі, але хутка зноў заснуў, і гадзіны ранішняга сну было дастаткова, каб гэтае найістотнейшае перажыванне прытухла, а потым зноў авалодала ягонымі думкамі ад мімалётнай карціны дзіцячай ножкі. Якімі няўстойлівымі, нетрывалымі і залежнымі ад выпадку бываюць найглыбейшыя, найчароўнейшыя перажыванні нашай душы! Як гэтае, што не пакідала яму нічога, акрамя як аднавіць увесь свой сон. Ён мог адшукаць толькі разрозненыя малюнкі, не звязаныя паміж сабою часткі, некаторыя — свежыя і поўныя жыццёвага святла, іншыя — ужо звялыя і пажоўклыя, пазначаныя бясформнасцю. І што гэта быў за цудоўны, глыбокі, адухоўлены сон! Як білася ягонае сэрца ў час першага начнога абуджэння, салодка і ўрачыста, як у дзяцінстве на свята! Як пранізала яго жыццядайнае пачуццё, нібыта з гэтым сном прыйшло нешта вельмі дарагое, важнае, незабыўнае і нязменнае! І цяпер, праз некалькі гадзін, яшчэ заставаліся ў яго гэтыя аскепачкі, гэтая пара ўжо амаль развеяных малюнкаў, гэтае лёгкае водгулле ў сэрцы, — усё астатняе знікла, мінула, было мёртвым!

Зрэшты, хоць бы нешта было ўратавана. Пісьменнік адразу ж вырашыў адшукаць у сваёй памяці ўсё, што там яшчэ заставалася ад сну, каб апісаць яго так дакладна і праўдзіва, як толькі магчыма. Ён тут жа дастаў нататнік і тэзісна, наколькі магчыма, зрабіў першыя запісы, агульную структуру, абрысы, галоўныя лініі ўсяго сну. Але гэта яму не ўдавалася. Невядомымі заставаліся пачатак і канец, а адносна большасці ацалелых урыўкаў ён не мог з пэўнасцю сказаць, якое месца займалі яны ў сюжэце гісторыі. Не, ён мусіць зноў пачынаць спачатку. Ён мусіць найперш ратаваць тое, што яшчэ было дасягальным, мусіць затрымаць некалькі нязгаслых пакуль малюнкаў, найперш — дзіцячыя чаравічкі, бо і яны таксама зляцяць, гэтыя пужлівыя чароўныя птушкі.

Як магілыпчык, што імкнецца расчытаць ацалелыя пісьмёны на старажытным камені, узіраючыся у так мала зразумелыя літары ці піктаграмы, наш герой спрабаваў прачытаць свой сон, складваючы яго кавалак да кавалка.

У сне была нейкая дзяўчынка, дзіўная, магчыма, не зусім прыгожая, але проста чароўная дзяўчынка, якой было, пэўна, год трынаццаць або чатырнаццаць, але выглядала яна меншай за гэты ўзрост. У яе быў смуглявы твар. Яе вочы? Не, вачэй

ён не бачыў. Яе імя? Невядома. Яе стаўленне да яго, да таго, хто яе сасніў? Стоп! Тут былі карычневыя чаравічкі! Ён бачыў, як перад ім прабеглі браты-блізняты гэтых боцікаў, бачыў іх танец, бачыў, як яны рабілі ў танцы крокі, крокі бастона. О так!.. Але зноў усё заблыталася. Ён мусіў усё пачынаць спачатку.

Такім чынам. У сне ён танчыў з адной чароўнай, чужой маленькай дзяўчынкай, дзіцём са смуглявым тварам і ў карычневых чаравічках. Ці ўсё астатняе таксама было карычневым? І валасы? І вочы? І сукенка? Не, гэтага ён не ведаў, толькі здагадваўся. Гэта выглядала магчымым, але не дакладным. Ён мусіў трымацца толькі таго, што было дакладным, інакш сон расплывецца да бязмежжа. Ужо цяпер ён пачаў адчуваць, што гэтыя пошукі сну завядуць яго вельмі далёка, што ён ужо выправіўся ў доўгі, бясконцы шлях. І як раз цяпер адшукаўся яшчэ адзін кавалак.

Так, ён танчыў з малечай, або хацеў танчыць, або павінен быў, і яна зрабіла — яшчэ пакуль адна — некалькі выразных, вельмі грацыёзных і чароўна дакладных па. Але потым, ці потым танчыў ён з ёю? Не. Не, ён не танчыў, а толькі хацеў, самае большае, было толькі дамоўлена, што ён будзе танчыць гэтым маленькім медзведзяняткам. Але танчыць яна пачала адна, без яго, а ён быў крыху напалоханы або збянтэжаны танцам: гэта быў дрэнна знаёмы яму бастон. Але яна пачала танчыць адна, артыстычна, чароўна рытмічна і старанна выпісвалі на дыване фігуры танца яе карычневыя чаравічкі. Чаму ж не танчыў ён сам? Ці чаму хацеў танчыць спачатку? Што за дамоўленасць гэта была? Ён не мог адшукаць адказаў.

І ўзнікла яшчэ адно пытанне: на каго была падобнай гэтая любая маленькая дзяўчынка, каго нагадвала яна? Шмат часу пайшло на марныя пошукі, усё зноў пачало здавацца безнадзейным, у нейкае імгненне вярнуліся незадаволенасць і раздражненне, ён зноў намерыўся адмовіцца ад усяго.

Ды вось чарговы раз ублытаўся выпадак, замільгаў новы след. Дзяўчынка нагадвала ягоную каханую. О не, яна зусім не была на яе падобнай, больш за тое, ён нават быў перакананы, што паміж імі вельмі мала падабенства, проста малютка была яе сястрою. Яе сястрою? Дык гэта ж выводзіла яго на след, усё набывала сэнс, усё зноў было тут. Ён пачаў занатоўваць па-новаму, захоплены раптоўна атрыманым надпісам, нібы зачараваны вяртаннем страчанай мроі.

Усё было так. Яму снілася Магда, на той час — ягоная каханая, пры чым была яна не такой, як звычайна апошнім часам, злоснай і сварлівай, а наадварот — ласкавай, нейкай ціхай, але вельмі мілай і прыемнай. Магда павітала яго з нейкай асаблівай чароўнасцю, без пацалунка. Яна падала яму руку і сказала, што пазнаёміць яго нарэшце са сваёй маці. І разам з маці будзе таксама яе малодшая сястра, якая, безумоўна, стане яму потым каханай і жонкай. Сястра нашмат за яе малодшая і вельмі любіць танцы. Ён найхутчэй набудзе яе прыхільнасць, калі патанчыць з ёю.

Якою прыўкраснаю была Магда ў гэтым сне! Якая непаўторнасць, якая мілата, якія цеплыня і чароўнасць яе душы — такою жыла яна ва ўяўленні ў часы ягонага вялікага кахання — выпраменьваліся з яе веснавых вачэй, са светлага чала, з яе духмяных валасоў!

І далей яму снілася, як яна павяла яго ў дом, у яе дом, у дом яе маці і яе дзяцінства, у дом яе душы, каб там паказаць яго маці і маленькай прыгожай сястрычцы, каб ён з гэтай ся- стрычкай пазнаёміўся і пакахаў яе, бо яна была прызначаная яму ў каханыя. Ён, аднак, не мог зараз успомніць сам дом, толькі пусты вестыбюль, дзе мусіў чакаць, як не мог прыгадаць і маці, а бачыў на заднім плане толькі старую жанчыну, апранутую ў шэрае або чорнае бону ці нянька. Але потым прыйшла малеча, сястра, чароўнае дзіця, дзяўчынка гадоў дзесяці — адзінаццаці, аднак з выгляду ёй можна было даць чатырнаццаць. Асабліва яе нага ў карычневым чаравічку была такой дзіцячай, такой нявіннай, гарэзлівай і недасведчанай; яна не

мела яшчэ нічога ад дамы, аднак была ўжо споўненая жаноцкасцю! Дзяўчынка прыязна павіталася, і ў гэтае імгненне Магда для яго знікла, засталася толькі малеча. Згадаўшы параду, ён запрасіў яе на танец. Яна адразу ж засвяцілася, кіўнула і, не раздумваючы, пачала танчыць, адна, а ён не наважыўся схапіць яе і танчыць разам, таму што была яна такой прыгожай і самадастатковай у сваім дзіцячым танцы, а яшчэ таму, што гэта быў бастон, танец, у якім ён пачуваў сябе не надта ўпэўнена.

Падчас сваіх намаганняў зрабіць бачнай мрою літаратар мусіў адно імгнённе пасмяяцца з самога сябе. Ён спаймаў сябе на тым, што думаў пра неабходнасць намагчыся на новы вясновы верш, каб апець у ім усё гэта, яшчэ далёка не пераадоленае, — але так як думаў ён пра танец дзіцячых ножак, пра лёгкі, вабны рух карычневых чаравічкаў, пра акуратнасць фігураў, якія выпісвалі яны на дыване, і пра тое, што на ўсёй гэтай мілай грацыі і ўпэўненасці ляжыць яшчэ налёт збянтэжанасці і вее ад яе дзявочай сарамлівасцю, то зрабілася яму зразумелым, што варта ўславіць у песні толькі гэтую дзіцячую нагу, каб пераўзысці усё, што спявалі раннія паэты пра вясну, і юнацтва, і прадчуванне кахання. Але ледзь толькі ягоныя думкі заблукалі ў гэтую сферу, ледзь толькі ён пачаў гуляцца з думкаю пра верш "Аб назе ў карычневым чаравічку", як адчуў з жахам, што мроя зноў імкнецца выслізнуць ад яго, што ўся дабрашчасная карціна губляе сваю паэтычнасць і плавіцца. Ён педантычна прывёў у парадак свае думкі і адчуў, што ўвесь сон — а ён хацеў бы запісаць яго змест — больш не належыць яму цалкам, што ён пачынае рабіцца чужым і старым. І яшчэ ў той самы час ён адчуў, што так будзе заўсёды: гэты дзівосны малюнак будзе належаць яму і напаўняць ягоную душу сваім водарам толькі той час, пакуль ён будзе заставацца з ім усім сэрцам, — без думак, без намераў, без клопату.

У задуменні пакрочыў паэт дадому, несучы перад сабою свой сон, як гафрыраванае, бясконца крохкае люстэрка з найтанчэйшага шкла. Яго перапаўняла трывога за сваю мрою. Ах, калі б пашчасціла яму аднавіць вобраз прымроенай каханай! Узнавіць з карычневага чаравічка, з фігураў танцу, са смуглявага мігцення на твары дзяўчынкі — з усіх гэтых малакаштоўных аскепкаў — тое, што падавалася яму найважнейшым у свеце. І ці не мусіла гэта стаць бясконца важнай для яго справай? Ці не быў гэты дзівосны вясновы вобраз абяцаннем кахання, ці не быў ён народжаны з найлепшых і найглыбейшых крыніцаў ягонае душы як сімвал будучыні, як падабенства да выраку лёсу, крок насустрач да ягонай асабістай мары пра шчасце? Думаючы пра ўсё гэта, ён адчуваў глыбокае задавальненне. Хіба не цудоўна, што чалавек можа прысніць такое, што можа насіць у сабе гэты свет з чароўнай паветранай матэрыі, што ў нашай душы, у якой мы так часта намагаемся знайсці абломкі закінутых туды веры, сяброўства, любові, — што ўнутры ў гэтай душы могуць расцвітаць такія кветкі?

Прыйшоўшы дадому, літаратар зачыніў за сабою дзверы і лёг у крэсла. Трымаючы ў руках блакнот, ён уважліва прачытаў чарнавікі і не знайшоў у іх ніякай вартасці, зразумеў, што яны не ствараюць, а толькі заблытваюць і загароджваюць. Ён разарваў аркуш і заклапочана знішчыў яго, пастанавіўшы нічога больш не запісваць. Разнерваваны, лёг і пастараўся засяродзіцца, і раптоўна да яго вярнулася яшчэ адна частка мроі, раптоўна ўбачыў ён сябе зноў у чужым доме, падчас чакання ў гэтым голым вестыбюлі, убачыў на заднім плане, як ходзіць туды сюды апранутая ў чорнае заклапочаная старая пані, яшчэ раз адчуў лёсавызначальные імгненне: што зараз прыйдзе Магда, каб прывесці з сабою ягоную новую, юную, прыўкрасную, ягоную сапраўдную і вечную каханую. Добразычліва і заклапочана глядзела ў яго бок старая жанчына — і за яе фігурай, за яе шэрай сукенкай узніклі іншая фігура і іншая сукенка, твар вартаўніцы і апякункі ягонага ўласнага дзяцінства, твар і шэрая хатняя сукенка ягонай маці. І з гэтага новага пласта ўспамінаў, з мацярынскага, сястрынскага звяна карціны — ён адчуваў гэта — прарастаюць яму насустрач Будучыня і Любоў. Па-за гэтым пустым вестыбюлем, пад клапатлівымі, споўненымі любові і адданасці позіркамі маці і Магды было падаравана дзіця, чыё каханне

зрабіла яго шчаслівым, валоданне якім было шчасцем і будучыня якога павінна была стаць ягонай уласнай будучыняй.

І цяпер ён па-новаму яшчэ раз убачыў Магду, тое, як яна асабліва, пяшчотна-строга павіталася з ім, як яшчэ раз, нібы вечаровая заранка, засвяцілася яе аблічча ўсім сваім — былым ужо для яго — чароўным харастом, як у імгненне адрачэння і развітання заззяла яна яшчэ раз усёю сілаю кахання іхніх мінулых часоў, як яе адухоўленае і паэтычнае аблічча прарочыла тое Маладое, Прыгожае, Сапраўднае, Адзінае, дзеля якога прыйшла яна, каб прывесці да яго і дапамагчы заваяваць. Усё, што раней убачыў, прымроіў, пажадаў, выдумаў ён у гэтай жанчыне, уся мілата і абагаўленне, якімі гарэў ён у мінулыя часы свайго вялікага кахання, былі зараз у гэтым абліччы, уся яе душа разам з ягоным уласным каханнем праступалі на ім, выразна праменіліся са строгага чароўнага чала, усміхаліся сумна і прыязна з яе вачэй. Ці магчыма гэта — развітацца з такой каханай? Але позірк яе казаў: ты мусіш развітацца, мусіць спраўдзіцца новае.

І сюды на маленькіх жвавых дзіцячых ножках прыйшло новае, прыйшла сястра, але яе аблічча не было бачным, нельга было разгледзець нічога, акрамя таго, што яна маленькая і грацыёзная, абутая ў карычневыя чаравічкі, смуглявая з твару і апранутая ў карычневае і што яна танчыць з дзівоснай дасканаласцю. І менавіта бастон — танец, амаль незнаёмы яе будучаму каханаму. Нішто іншае не магло так дакладна выразіць перавагу дзіцяці над дарослым, вопытным і шмат у чым расчараваным чалавекам, як тое, што яна так свабодна, і вытанчана, і чыста танчыць, і як раз той танец, у якім ён быў такім слабым, такім безнадзейна залежным ад яе!

Цэлы дзень літаратар разважаў пра свой сон, і чым глыбей пагружаўся ўяго, тым прыгажэйшым ён выглядаў і тым больш пераконваўся ён, што зможа пераўзысці ўсю паэзію найлепшых паэтаў. Значна пазней, праз шмат дзён пасля здарэння, аддаваўся ён жаданням і планам так апісаць свой сон, каб ён не толькі для яго самога, але і для іншых паўстаў увасабленнем невымоўнай красы, глыбіні і пранікнёнасці. Аднак потым, паспрабаваўшы ажыццявіць свае жаданні і намеры, ён зразумеў: давядзецца прымірыцца з тым, што ў душы ён — сапраўдны паэт, летуценнік і прарок, аднак па прафесіі мусіць заставацца ўсяго толькі літаратарам.

(1926)

**пераклала Наталля Давыдоўская**